

**КАПІТАЛЬНЫ РАМОНТ ДОМА.**
УЛІЧЫЦЬ МЕРКАВАННІ ЖЫЛЬЦОЎ

3

**НЕЖЫЛОЕ ЖЫЛЛЁ.**
ШТО РАБІЦЬ З ПУСТУЮЧЫМІ ХАТАМІ?

МС



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

24 ЖНІЎНЯ 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 162 (28778)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Леанід ЗАЯЦ, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання:**

*«Хлеба ў краіне будзе дастаткова. Нам засталося 160 тысяч тон збожжа да выканання дзяржзаказу. Будзем з белым і чорным хлебам, крупамі, малаком і мясам — усім неабходным. Засуха, якая паўплывала на ўраджай, не адаб'ецца на харчовых паліцах і кашальках нашых грамадзян. Уборачная кампанія зараз знаходзіцца на завяршальнай стадыі. «Яшчэ два-тры дні — і завершым уборку збожжавых. Застануцца крупяныя культуры: грэчка і проса, якія будзем дамалочваць некалькі пазней. Па даных на 23 жніўня, збожжавыя і зернебабовыя культуры сабраныя з 1,94 млн га, што складае 96,4 % запланаванай плошчы».*

# НОВЫХ ПРАБЛЕМ У СТРАТЭГІЧНЫМ ПАРТНЁРСТВЕ НЯМА

**Пра гэта заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным увечары 22 жніўня ў Сочы.**

«Нам сапраўды ёсць аб чым пагаварыць. Але я не сказаў бы, што ў нас назапашваюцца праблемы. У нас праблемы ёсць, якія вырашаюцца хутка або доўга не вырашаюцца. Але новыя праблемы, на шчасце, не з'яўляюцца, як я прааналізаваў, за апошні час. Тым не менш гэтыя праблемы без нас ніхто не вырашыць. І некаторыя праблемы і не нашы даводзіцца вырашаць, як у нас часта з вамі бывае. Таму сапраўды ёсць пра што пагаварыць. І я буду рады, калі вы папоўніце мае веды ў плане міжнародных адносін, вашых сустрэч, вашых уражанняў і сумесных дзеянняў на міжнароднай арэне», — цытуе беларускага лідара яго прэс-служба.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Уладзіміру Пуціну за запрашэнне «прыехаць, крыху абстрагавацца ад жыццёвых прэзідэнцкіх праблем». «Я штогод бываю тут. Тут кавалак зямлі Беларусі. І я пры любым зручным выпадку імкнуся сюды прыехаць для таго, каб на 3-4 дні адысці ад тых праблем, якія заўсёды назапашваюцца. Яны аднолькавыя ўсюды. І ў вас іх хапае, толькі ў большых аб'ёмах», — дадаў кіраўнік беларускай дзяржавы.



Фота БелТА.

Уладзімір Пуцін адзначыў, што рады сустрэцца з Прэзідэнтам Беларусі і сам-насам абмеркаваць пытанні, якія датычацца развіцця двухбаковага супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння ў розных інтэграцыйных фарматах, праблематыку міжнароднага парадку дня.

«Мы з вамі сустракаемся рэгулярна, але тым не менш кожная з гэтых сустрэч мае значэнне і вельмі важная для нас», — падкрэсліў ён.

Пасля завяршэння перагавораў кіраўнікі дзяржаў абмяняліся падарункамі. Аляксандр Лукашэнка падарыў Уладзіміру Пуціну абраз Анёла Ахоўніка. Кіраўнік расійскай дзяржавы ў сваю чаргу падарыў Прэзідэнту Беларусі карціну на тканіне, якую выканалі ўральскія майстры.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# НЁМАН І НАТХНЕННЕ

**Вёска Купіск Навагрудскага раёна лічыцца вёскай мастакоў. Тут стала жыве вядомы аўтар пейзажаў Віктар Залацілін, пра якога «Звязда» нядаўна расказвала. А Мікалай ГЕРАСІМАЎ *(на фота)* прыязджае ў Купіск на лета ў бацькоўскі дом з Вільнюса, каб удосталь памаляваць, наталіцца прыгажосцю нёманскага краю — вёска знаходзіцца ў маляўнічым кутку на беразе ракі. Гэту прыгажосць проста нельга не намаляваць.**

## КОРАТКА

- **Налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў краіны ў ліпені склала Br973,8, у чэрвені гэты паказчык дасягаў Br953,7.**



- У Брэсцкай вобласці сёлета доля энергаэфектыўнага жылля сярод таго, якое будуецца, складзе 97 %.
- **Батл баяністаў пройдзе 25 жніўня ў рамках фестывалю «Аўгустоўскі канал у культуры трох народаў».**
- Гарадзенец паверыў навіне аб спадчыне ў 36 млн еўра пасля смерці багатага сваяка ў Іспаніі і пераеў ашуканцам 8 тыс. еўра.
- **Учора ва ўзросце 52 гадоў памёр заснавальнік і кіраўнік інфармацыйнай кампаніі «БелаПАН» Алесь Ліпай.**

■ Справа для душы

# «БЫЦЦАМ НА 20 ГАДОЎ ПАМАЛАДЗЕЛА»

## Як харавік стала званаром

**Мінчанцы Вользе САЎЧАНКАВАЙ за 60. Невысокая бландзінка, з мілагучным голасам і абаяльнай усмешкай. Калі б сустрэла яе ў горадзе, не падумала б, што перада мной званар — здаецца, гэта прафесія патрабуе куды больш сіл, чым ёсць у гэтай жанчыны. Але вось ужо пяты год Вольга склікае на службу прыхаджан Свята-Петра-Паўлаўскага сабора. Пра тое, як звон стаў аддушынай і лекам, — у яе гісторыі.**

СТАР. 4



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

ISSN 1990 - 763X

■ Ва ўрадзе

# КІРУНКІ ВЫЗНАЧАНЫ

**Абавязкі паміж прэм'ер-міністрам, яго намеснікамі і кіраўніком Апарату Саўміна размеркаваныя, паведамляе БелТА.**

**Прэм'ер-міністр Сяргей РУМАС ажыццяўляе кіраўніцтва непасрэдна дзейнасцю Савета Міністраў. Ён курыруе пытанні ўнутраных спраў, замежных спраў, абароны, бюджэту, фінансаў, дзяржаўнай бяспекі, юстыцыі, МУС, МЗС (акрамя пытанняў знешнеэканамічнай дзейнасці), міністэрствы абароны, сувязі і інфарматызацыі, фінансаў (у частцы пытанняў выканання рэспубліканскага бюджэту), юстыцыі (акрамя пытанняў Дэпартамента па архівах і справаводстве), КДБ, Дзяржпагранкамітэт, аблвыканкамы і Мінскі гарвыканкам, Апарат Савета Міністраў.**

Сяргей Румас забяспечвае агульнае кіраванне і кантроль за інвестыцыйнай дзейнасцю, выкананнем найважнейшых параметраў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі, выкананнем рэспубліканскага бюджэту. Каардынуе пытанні ўзаемадзеяння з Нацыянальным сходам, Канстытуцыйным судом, Вярхоўным судом, Дзяржаўным сакратарыятам Савета бяспекі, Генеральнай пракуратурай, Нацыянальным банкам, Следчым камітэтам.

**Першы намеснік прэм'ер-міністра Аляксандр ТУРЧЫН** адказвае за каардынацыю і кантроль за знешнеэканамічнай дзейнасцю рэспубліканскіх дзяржорганаў і іншых арганізацый, падпарадкаваных ураду, для забеспячэння выканання найважнейшых параметраў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны па экспарце тавараў і паслуг, сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі. Аляксандр Турчын курыруе пытанні эканомікі, падатковай і грашова-крэдытнай палітыкі, знешнеэканамічнай дзейнасці, лагістыкі, фінансавага забеспячэння інвестыцыйнай дзейнайсці і ацэнкі эфектыўнасці інвестыцыйных праектаў, дзяржаўных знакаў, каштоўных металаў, страхавой дзейнасці, каштоўных папер, маёмасных адносін (уключаючы кіраванне, распараджэнне, прыватызацыю, ацэнку і ўлік маёмасці, што знаходзіцца ва ўласнасці Беларусі), прадпрымальніцтва, гандлю, паслуг насельніцтву, мытнай справы, міжнародных фінансавых і эканамічных арганізацый, свабодных эканамічных зон. Таксама ён курыруе пытанні развіцця лічбавай эканомікі.

**Намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір КУХАРАЎ** адказвае за пытанні развіцця будаўнічага комплексу, транспарту і камунікацый, жыллёвай і камунальнай гаспадаркі, надзвычайных сітуацый.

**Віцэ-прэм'ер Ігар ЛЯШЭНКА** курыруе пытанні развіцця прамысловасці, у тым ліку абаронных галін, энергетычнага комплексу, энергаэфектыўнасці, якасці і канкурэнтаздольнасці прадукцыі прамысловасці, стандартызацыі, збору, перапрацоўкі лому і адходаў чорных і каляровых металаў, навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці, інтэлектуальнай уласнасці, імпартазамяшчэння, фарміравання балансу паліўна-энергетычных рэсурсаў Саюзнай дзяржавы.

**Намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА** ажыццяўляе рэалізацыю паўнамоцтваў прадстаўніка ад Беларусі ў Савеце Еўразійскай эканамічнай камісіі, па пытаннях дзейнасці Беларусі ў рамках Саюзнай дзяржавы, Еўразійскага эканамічнага саюза, нацыянальнага каардынатара Беларусі па пытаннях СНД. Ігар Петрышэнка курыруе пытанні сацыяльна-культурнай сферы, адукацыі, аховы здароўя, спорту, друку, аздараўлення і санаторна-курортнага лячэння насельніцтва, уключаючы аздараўленне дзяцей за мяжой, гуманітарнай дзейнасці, сацыяльнай абароны, архіваў і справаводства. Ён будзе займацца каардынацыяй работы кіраўніцтва ўрада з насельніцтвам.

**Віцэ-прэм'ер Міхаіл РУСЫ** курыруе пытанні развіцця аграпрамысловага комплексу, вытворчасці і перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі, харчовых рэсурсаў, лясной гаспадаркі, прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, мінеральна-сыравіннай базы, гідраметэаралогіі.

У залежнасці ад напрамкаў, якія яны курыруюць, за віцэ-прэм'ерамі замацаваны адпаведныя міністэрствы і іншыя дзяржорганы ■




## Ігар БУЗОЎСКІ:

# «БЕЛАРУСКІЯ КНІЖНІКІ ГОДНА ВЫГЛЯДАЮЦЬ У ПЕКІНЕ...»

**Дэлегацыя Рэспублікі Беларусь прымае ўдзел у 25-й Маскоўскай кніжнай выстаўцы-кірмашы ў Пекіне. Пра тое, як выглядаюць беларускія кнігавыдаўцы на фоне сусветных здабыткаў у выдавецкай справе, паліграфіі, наш карэспандэнт задаў некалькі пытанняў кіраўніку дэлегацыі — намесніку міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ігару БУЗОЎСКАМУ.**



***— Ігар Іванавіч, наколькі прадстаўнічай з'яўляецца экспазіцыя нашай краіны на аўтарытэтным кніжным форуме ў Кітаі?***

— Беларусь прадстаўляюць вядучыя дзяржаўныя выдавецтвы краіны — «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», «Мастацкая літаратура», «Народная асвета», «Пачатковая школа». У складзе дэлегацыі — кіраўнікі «Белкнігі», паліграфкамбіната імя Якуба Коласа, сістэмы «Саюздрук», рэдакцыі самага тыражнага дзіцячага часопіса краіны «Вясёлка». І ўсе прыехалі ў Кітай са сваімі ініцыятывамі, прапановамі, праектамі да перамоў з тымі ці іншымі кітайскімі выдавецтвамі, кнігагандлёвымі арганізацыямі. Безумоўна, мы прывезлі найлепшыя кнігі ўсіх выдавецтваў краіны. Найперш — тыя выданні, што перамаглі ў айчынным конкурсе «Мастацтва кнігі», у конкурсе сярод краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў «Мастацтва кнігі».

***— Дарэчы, некалькі слоў пра тое, што ўжо зроблена ў Беларусі ў межах беларуска-кітайскіх кнігавыдавецкіх ініцыятыў...***

— Мне прыемна было выступаць і на адкрыцці стэнда, і з інтэрв'ю для розных мас-медыя Кітая і іншых краін. У Беларусі літаральна за апошнія пяць-сем гадоў выдадзена больш за паўсотню кніг на кітайскую тэматыку — як на беларускай і рускай мовах, так і на кітайскай і беларускай адначасова. Шырокі спектр мастацкай літаратуры Кітая выдадзены «Адукацыяй і выхаваннем» (гэта і кнігі новых перакладаў на рускую мову кітайскіх класікаў — Лі Бо, Ду Фу. Пераклады здзейснены, між іншым, у Беларусі, Мінску), Выдавецкім домам «Звязда» (адлік серыі кніг «Светлыя знакі. Паэты Кітая» ўжо ідзе на другі дзясятак выданняў. І гэта не ўсе кітайскія кніжныя ініцыятывы «Звязды»), «Мастацкай літаратурай» (гэта і беларускамоўны энцыклапедычны даведнік па Кітаі — праект, рэалізаваны сумесна з кітайскім бокам, з прыцягненнем сродкаў з КНР), «Беларускай навукай» (кнігі па этнаграфіі, фальклоры — на дзвюх мовах)... Вельмі шмат кніг выдалі аспіранты, навукоўцы з Кітая, якія абараняюць свае дысертацыі ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, Беларускім дзяржаўным універсітэце (гэта — манаграфіі, прысвечаныя тэатру, выяўленчаму мастацтву, харэаграфіі, музыцы, журналістыцы, розным пытанням культуралогіі). Асобная бібліятэчка кніг — работы, прысвечаныя дыпламатычным адносінам, кнігі публіцыстыкі пра сучасны Кітай, сучасны стан беларуска-кітайскіх адносін. У гэтым плане шмат зроблена Рэспубліканскім інстытутам кітаязнаўства імя Канфуцыя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Тэматыка літаратуры пашыраецца. Гэтаму спрыяе і выданне беларускага грамадска-публіцыстычнага часопіса «Беларусь» на кітайскай мове.

***— Наколькі дастаткова дагавораў, пагадненняў у галіне кнігавыдавецкай дзейнасці паміж Беларуссю і Кітаем?***

— У час выстаўкі мы нагадалі кітайскаму боку пра існуючы паміж нашымі краінамі «Мемарандум аб супрацоўніцтве паміж нашым Міністэрствам інфармацыі і Галоўным дзяржаўным упраўленнем па справах прэсы, выдавецтваў, радыёвяшчання, кінематаграфіі і тэлебачання КНР». У межах гэтага мемарандума, які быў падпісаны ў Мінску ў лютым 2015 года, існуе і «Праект перакладу і публікацыі класічных літаратурных твораў на 2015—2020 гады». Зараз, між іншым, выдавецтва «Мастацкая літаратура» распачало рэалізацыю шырокага праекта па прадстаўленні ў Беларусі кніг пра культуру Кітая. Мяркуецца, што будуць выдадзены чатыры грунтоўныя зборнікі. Праект рэалізоўваецца з удзелам кітайскіх інвестыцый. Дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь Бадак падчас выстаўкі ўдакладняе фармат працы над гэтай серыяй, выбудоўвае ўжо тактычныя рашэнні. Стратэгія ж вызначана падчас ранейшых перамоў.

У сёлетнім верасні ў адной з мінскіх кнігарняў будуць адкрыты кітайскія паліцы. Гэтай справай апякуецца «Белкніга». Так што з'явіцца ў Мінску і месца, дзе можна будзе не толькі азнаёміцца з апошнімі кітайскімі кніжнымі навінкамі, але і набыць іх. І гэтая справа забяспечана кітайскай інвестыцыйнай падтрымкай.

***— Як шмат наведвальнікаў падыходзіць да стэнда Рэспублікі Беларусь?***

— Досыць многія цікавяцца і кнігамі, і, адпаведна, нашай краінай. Відавочна, што кітайцы добра ведаюць Беларусь, часта згадваюць візіты Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Кітай. Прыходзіць шмат кітайцаў, якія ў розны час пабывалі ў Беларусі. На нашым стэндзе прадстаўлена шмат грамадска-палітычнай літаратуры, выданняў, якія расказваюць пра Беларусь, адлюстроўваюць нашу дзяржаўную сімволіку, паказваюць турыстычныя адметнасці розных куточкаў краіны.

У час перамоў з арганізатарамі выстаўкі і кіраўніцтвам Галоўнага дзяржаўнага ўпраўлення па справах прэсы, выдавецтваў, радыёвяшчання, кінематаграфіі і тэлебачання КНР дасягнута папярэдняя дамоўленасць аб тым, што Рэспубліка Беларусь будзе Ганаровым госцем наступнай, 26-й, Пекінскай кніжнай выстаўкі-кірмашу. Наша краіна стане галоўным экспанентам на такім аўтарытэтным форуме кніжнікаў свету ў сталіцы Паднябеснай. Гэта вялікая адказнасць для ўсіх нас. Але — і цудоўная магчымасць паказаць Беларусь кніжную, стварыць новую пляцоўку для пашырэнняведання пра Рэспубліку Беларусь, пра наш агульнадзяржаўны патэнцыял у розных галінах. Адным словам, будзем рыхтавацца да гэтай падзеі. А на выстаўцы ў гэтыя дні прадоўжым весці стасункі, прадоўжым розныя перамовы. Дарэчы, шмат якія з ініцыятыў маюць падмурак зносін ранейшых. Вось у Другім Пекінскім універсітэце замежных моў працуе Цэнтр культуры Беларусі. Шмат рупіцца над яго ўплывамі на студэнтаў, выкладчыкаў доктар філалагічных навук спадарыня Чжан Хуэйцінь, якая нядаўна была адзначана падзякай міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Спадзяёмся, што дзякуючы супрацоўніцтву і з універсітэтам, і з цэнтрам на наступны год шырэйшай стане праграма нашага выставачнага візіту.

***— Выставачная пляцоўка — заўсёдная магчымасць для стасункаў з рознымі краінамі...***

— Так. І мы за гэтыя дні паспелі правесці цікавыя перамовы з аўтарытэтным арганізатарам выдавецкай справы ў Расійскай Федэрацыі Алегам Зімарыным, з Анджэем Касперскім з Польшчы, іншымі кнігавыдаўцамі і кнігараспаўсюджвальнікамі. Вярнуўшыся дадому, прааналізуем розныя найбольш важкія прапановы. І спадзяюся, што шмат што з іх вынесем карыснага. Заўважная такая акалічнасць: нягледзячы на сённяшнія магчымасці інтэрнэт-зносін, зносін у сацыяльных сетках, мала распаўсюджваецца інфармацыі, рэкламы пра зробленае, пра магчымасці. Вось шмат хто з кітайскага боку быў уражаны ўзроўнем беларускай кніжнай графікі, існуючага афармлення беларускай кнігі. Дамовіліся, што наладзім у гэтым плане стасункі. Сёння варта развіваць інтэграцыйныя праекты, сумесна, супольна кнігі варта выпускаць. Тэхналагічныя магчымасці для гэтага ёсць. Над гэтым перш-наперш і будзем працаваць.

**Гутарыў Сяргей ШЫЧКО.**

*Пекін — Мінск.*

■ Камунальныя стасункі

# РАМОНТ АБМЯРКУЕМ?

## ЖКГ плануе ўлічваць меркаванні жыльцоў пры планаванні капітальнага рамонту дома

**Пра гэта расказаў падчас прэс-канферэнцыі начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэй РАМАШКА.**

У 2015 годзе было прынята рашэнне аб вызначэнні пераліку складнікаў работ капітальнага рамонту, акрэслены паслугі, якія замацоўцца ў праектна-каштарыснай дакументацыі. За тры гады пералік істотна не змяняўся, але сёння, як лічыць начальнік упраўлення Мінжылкамгаса, патрэбна трансфармацыя ў самім падыходзе. Так, спажыўцы змогуць прыўнесці ў план дадатковыя віды работ. Адпаведнае рашэнне адлюстравана ў праекце пастанаўлення Савета Міністраў аб арганізацыі планавання, фінансавання капітальнага рамонту. Маецца на ўвазе праявдзенне сходаў са спажыўцамі яшчэ на стадыі падрыхтоўкі задання капрамонту на праектаванне.

— Рамонт — гэта тая паслуга ЖКГ, вакол якой штогод узнікае шмат пытанняў, нараканняў з боку карыстальнікаў жыллёвага фонду. Часткова яны маюць рацыю, аднак нельга не заўважыць станоўчыя зрухі. Так, за апошнія пяць гадоў аб'ёмы капітальнага рамонту, які выконваецца ў краіне, павялічыліся ў два разы, — адзначыў Андрэй Рамашка.


Фота Івана КУПАРВАСА.

Па яго словах, да 2010 года капітальны рамонт у Беларусі выконваўся аб'ёмамі менш за мільён квадратных метраў. Гэта сітуацыя склала «зону недарамонту», якую ЖКГ цяпер стараецца скараціць. На сёння больш за 13 мільёнаў квадратных метраў жылля патрабуюць таго ці іншага віду рамонту. Гэта каля 10 працэнтаў усяго жыллёвага фонду краіны, і паступова колькасць адрамантаваных плошчаў расце. У дзяржаўнай праграме «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» ўстаноўлены штогадовы паказчык росту, які сёлета павінен скласці 2900 тысяч квадратных метраў, а ў 2020 годзе дасягнуць 3600 тысяч. Як і ў мінулыя гады, асноўнымі крыніцамі фінансавання для правядзення работ з'яўляюцца штомесячныя выплаты з боку насельніцтва і бюджэтнае фінансаванне. За кошт дзяржаўных сродкаў выконваецца 2/3 работ.

Сярод прычын, якія прыводзяць да невыканання тэрмінаў рамонту, Андрэй Рамашка адзначыў розныя фактары, у тым ліку неналежную арганізацыю самога працэсу. Асобныя жыльцы не дапускаюць рабочых у жылыя памяшканні, выклікаюць нараканні дзеянні некаторых падрадчыкаў, але ў агульным кожны выпадак патрабуе дэталёвага падыходу для вырашэння. Адказнасць за жыллёвы фонд ляжыць на мясцовых выканаўча-распарадчых органах, і яны павінны кантраляваць яго эксплуатацыю.

Замена індывідуальных лічыльнікаў — яшчэ адна «гарачая» тэма, якая хвалюе жыльцоў. Сёння даныя па выкарыстанні рэсурсаў можна перадаць праз тэлефон, але ў хуткім часе гэты працэс можа быць мадэрнізаваны.

— У першую чаргу замена прыбораў індывідуальнага ўліку датычыцца кантролю за расходам вады. Замена лічыльнікаў адбудзецца за кошт сродкаў на капітальны рамонт. Сёння праект пастанаўлення знаходзіцца ў Савеце Міністраў, думаю, найбліжэйшым часам ён будзе прыняты, і работы распачнуцца ўжо з наступнага года. Сёння нішто не перашкаджае заказчыкам, арганізацыям ЖКГ уносіць дадатковыя змены ва ўжо распрацаваныя праекты, — дадаў Андрэй Рамашка.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ**

■ Надвор'е

# У ВЫХАДНЫЯ — СПЁКА І ДАЖДЖЫ

**Да 30 градусаў цяпла з дажджамі чакаецца ў выхадныя па Беларусі, паведамілі БелТА ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя.**

Ужо сёння ў другой палове дня паветра прагрэецца ад 23 градусаў на паўночным усходзе і да 30 на захадзе краіны. Пераважна без ападкаў, толькі на захадзе Брэсцкай і Гродзенскай абласцей магчымы кароткачасовыя дажджы, навальніцы, днём — парывісты вецер.

У найбліжэйшыя выхадныя надвор'е будуць вызначаць малярухомыя франтальныя сістэмы, якія перамяшчаюцца з Заходняй Еўропы. У суботу ноччу ў заходніх, а днём і ў цэнтральных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, днём у асобных раёнах — моцныя, месцамі навальніцы. Вецер паўднёвы, паўднёва-ўсходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 10 на ўсходзе да 18 градусаў на захадзе, днём — ад 21 па паўночным захадзе да 30 па паўднёвым усходзе.



У нядзелю ў заходніх і цэнтральных раёнах чакаюцца кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах пройдуць моцныя дажджы, навальніцы. Вецер будзе паўночна-заходні і паўночна-заходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 12—18, днём — 18—25, на паўднёвым усходзе — 26—30 градусаў

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## 3-за тайфуну ў Японіі адмянілі гістарычныя вучэнні і больш за 300 авіярэйсаў



Улады Японіі рыхтуюцца да новага ўдару стыхіі, на гэты раз у сувязі з набліжэннем магутнага трапічнага тайфуну Cimaron. Прэм'ер-міністр краіны Сіндза Абэ распарадзіўся прыняць усе магчымыя меры, каб мінімізаваць магчымыя наступствы. Па даных метэаралагічнага ўпраўлення краіны, тайфун наблізіцца да Сікоку ўвечары 24 жніўня. У краіне адменены ўжо па меншай меры 333 унутраныя авіярэйсы. Чыгуначная кампанія JR таксама паведаміла аб спыненні з вечара чацвярга хуткасных экспрэсаў на шэрагу кірункаў. Акрамя таго, з-за набліжэння тайфуну Японія і Вялікабрытанія адмянілі першыя ў гісторыі сумесныя ваенныя вучэнні. Японскія СМІ адзначаюць, што тайфун абрынецца на шэраг раёнаў, якія да гэтага часу адначуляюцца пасля моцнай паводкі і сходу апоўзняў у пачатку ліпеня, выкліканых магутным тайфунам Prapiroon.

## Афрыканскія мігранты штурмам прарваліся ў Іспанію



Больш за 100 афрыканскіх мігрантаў у сераду змаглі прарвацца на абгароджаную тэрыторыю іспанскага аўтаномнага горада Сеуты, размешчанага на паўночным узбярэжжы Марока. Як паведамляецца, бежанцы, большасць з якіх — гэта агрэсіўна настроеныя маладыя людзі, выкарыстоўвалі інструменты для рэзкі металу, каб зрабіць праход у падвойным паркане. Частка з іх здолела пералезці цераз шасціметровую агароджу. Супрацоўнікі мараканскіх і іспанскіх праваахоўных органаў не змаглі стрымаць нелегалаў. У выніку былі параненыя не менш як сем паліцэйскіх. Як вядома, у канцы ліпеня каля 600 мігрантаў змаглі прарвацца на тэрыторыю Сеуты. Яны ўпершыню выкарысталі супраць памежнікаў зброю — самаробныя агнямёты.

## Прэм'ер Аўстраліі заявіў пра магчымы сыход з палітыкі

Прэм'ер-міністр Аўстраліі Малькальм Тэрнбул заявіў, што сыдзе з палітыкі, калі яго калегі арганізуюць паўторнае галасаванне па пытанні пра лідара кіруючай Ліберальнай партыі, піша газета Sydney Morning Herald.



У аўторак Тэрнбул з цяжкасцю выйграў аналагічнае галасаванне, ініцыяванае былым кіраўніком МУС Пітэрам Датанам. Аднак учора яшчэ некалькі высокапастаўленых членаў урада, у тым ліку міністр фінансаў Матыяс Корман, заявілі аб страце даверу да Тэрнбула. Прэм'ер пагадзіўся на правядзенне паўторнай партыйнай нарады ў пятніцу пры ўмове, што атрымае афіцыйную петыцыю, падпісаную большасцю парламенцкіх лібералаў. Ён заявіў, што пойдзе ў адстаўку, калі на сустрэчы запатрабуюць прагаласаваць за новага лідара, які, адпаведна, зойме пасаду прэм'ера. Аўстралійскія СМІ паведамляюць, што ў выпадку правядзення галасавання найбольшыя шанцы на перамогу, акрамя Пітэра Датана, мае міністр па ўрадавых расходах Скот Морысан.

## Эксперты склалі рэйтынг краін з самай таннай мабільнай сувяззю



Эксперты International Telecommunication Union склалі топ-10 краін з самай таннай мабільнай сувяззю ў свеце. Першае месца ў гэтым рэйтынгу займае Шры-Ланка. Усяго ў Шры-Ланцы існуе пяць аператараў сотавай сувязі: Dialog, Mobitel, Etisalat, HUTCH, Airtel. Аператар сотавай сувязі Mobitel належыць Sri Lanka Telecom — дзяржаўнай тэлефоннай кампаніі. Нягледзячы на гэта, лідарам сотавых аператараў у гэтай краіне па колькасці абанентаў з'яўляецца аператар Dialog. У сярэднім абаненты ў месяц плацяць тут за мабільную сувязь 0,97 долара. На другім месцы — Бангладэш, сістэма сотавай сувязі ў якім апошнія 10 гадоў перажыла імклівы ўзлёт, і цяпер тут налічваецца каля 40 млн абанентаў. У сярэднім у месяц на сувязь мясцовыя жыхары трацяць не больш за 1,42 долара. Тройку лідараў замыкае Іран (2,01 долара). Сотавая сувязь стандарту GSM 900 развіваецца тут надзвычай хутка па ўсёй краіне. Пры гэтым развіццё інтэрнэту ў Іране пачалося адносна нядаўна, таму яго распаўсюджванне пакуль абмежавана, але развіваецца ён таксама імклівымі тэмпамі. Акрамя таго, у дзясятку краін з самай таннай мабільнай сувяззю ўвайшлі: Пакістан (2,12 долара), Непал (2,49 долара), Індыя (2,8 долара), Бутан (2,95 долара), Манголія (3,16 долара), Эфіопія (3,28 долара) і Судан (3,33 долара).

■ Ну і ну!

# Скраў у іспанца 50 тысяч еўра

**У Цэнтральнае РУУС сталіцы звярнуўся жыхар Іспаніі з просьбай устанавіць асобу чалавека, які здзейсніў крадзеж 50 тысяч еўра, якія належалі яму.**

Як высветлілася, 43-гадовы замежнік у момант здарэння перасоўваўся па пешаходным пераходзе, размешчаным на вуліцы Крапоткіна. Мужчына, які ішоў за ім, падчас руху выцягнуў з заплечніка скрутак з грашовымі сродкамі, пасля чаго знік. Тут у адносна высокай ступені здзіўляе як лоўкасць рук зладзюжкі, так нейкая незразумелая бесклапотнасць іспанца, які чамусьці не адчуў, што яму нехта залез у заплечнік...

Як паведамілі ў Цэнтральным РУУС г. Мінска, падазраваным па гэтай справе прызнаны 34-гадовы жыхар сталіцы, які раней неаднаразова прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за аналагічныя злачынствы. Мужчыну затрымалі і змясцілі ў ізалятар часовага ўтрымання. Скрадзеныя грашовыя сродкі канфіскаваны. Вядома, што іх частку ён паспеў патраціць. Падазраваны можа быць пакараны за свой учынак пазбаўленнем волі на тэрмін ад 3 да 12 гадоў з канфіскацыяй маёмасці.

# Упаў на мангал

**Увечары карэліцкія ратавальнікі прынялі паведамленне, што ў прыёмнае аддзяленне раённай бальніцы паступіў 18-гадовы малады чалавек з тэрмічнымі апёкамі першай-другой ступені (12 працэнтаў паверхні цела).**

Высветлілася, што пацярпелы — жыхар гарадскога пасёлка Мір. Напярэдадні юнак на прыватным падворку распаліў мангал. У нейкі момант, праходзячы побач, ён аступіўся і ўпаў на вуглі. Бацькі выклікалі хуткую медыцынскую дапамогу. Пацярпелага пасля агляду шпіталізавалі ў хірургічнае аддзяленне.

Ратавальнікі нагадваюць: калі вы вырашылі пасмажыць шашлык на дварэ, памятайце, што мангалы і аналагічныя ўстройствы для гатавання ежы на адкрытым агні варта размяшчаць не бліжэй чым за чатыры метры ад пабудоў. Трымайце побач вядро з вадой ці аўтамабільны вогнетушыцель. Будзьце гранічна пільныя і асцярожныя пры абыходжанні з агнём.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Будзь у курсе!

## АТРЫМАЦЬ РАБОЧУЮ ПРАФЕСІЮ ЯШЧЭ НЕ ПОЗНА

**20 жніўня завяршыўся прыём дакументаў на ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Але ў шасці прафесійна-тэхнічных установах сталіцы запоўніліся не ўсе бюджэтныя месцы, таму на іх абвешчаны дадатковы набор.**

Як паведаміла **загадчыца сектара прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Алена ЧАРНЫХ**, прыём дакументаў падоўжаны пераважна ва ўстановах будаўнічага профілю.

— У цяперашні час гэты напрамак досыць запатрабаваны сярод заказчыкаў кадраў. Заработная плата ў такіх работнікаў перавышае сярэднюю па горадзе. Будаўнікі запатрабаваныя і патрэбныя, і прадпрыемствы-заказчыкі кадраў гатовыя ісці насустрач — заключаць з патэнцыйнымі навучэнцамі мэтавыя дагаворы. Аднак гэта накладае і пэўныя абавязацельствы: тэрмін адпрацоўкі пасля навучання па мэтавым дагаворы павялічваецца на адзін год, і гэта адпужвае абітурыентаў.

Сярод устаноў, у якіх аб'яўлены дадатковы набор, Мінскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж будаўнікоў імя Каменскага (36 месцаў), Мінскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва імя Кедышкі (каля 50 месцаў), Мінскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж будаўніцтва і камунальнай гаспадаркі (32 месцы), Мінскі дзяржаўны прафесійны ліцэй № 7 будаўніцтва (каля 50 месцаў), Мінскі дзяржаўны прафесійны ліцэй № 10 будаўніцтва імя І. М. Жыжаля (12 месцаў) і Мінскі дзяржаўны прафесійны ліцэй № 12 будаўніцтва (каля 50 месцаў).

Дадатковы набор навучэнцаў працягнецца па меры камплектавання груп. У камітэце па адукацыі спадзяюцца, што ўкамплектавацца ўдасца да 1 верасня. Пры любым раскладзе дадатковы набор скончыцца не пазней за 15 верасня.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Навіны сталіцы

## ЯК РЫХТУЕМСЯ ДА ХАЛАДОЎ

**Поўным ходам ідзе падрыхтоўка сталічнай гаспадаркі да асенне-зімовага перыяду. Як паведаміў намеснік генеральнага дырэктара па эксплуатацыі жыллёвага фонду і вытворчых пытаннях ГА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Цімафей КРЭМЕЗ, на сённяшні дзень выкананы такія мерапрыемствы, як рамонт дахаў і стыкаў сценавых панэляў, уцяпленне канструкцый агароджы, шэраг іншых неабходных работ.**

На абслугоўванні жыллёва-камунальнай гаспадаркі сталіцы знаходзяцца 6700 жылых дамоў. Ва ўсіх праведзены работы па прамыўцы ацяпляльных сістэм. Таксама выкананы прафілактычныя мерапрыемствы на сістэмах электразабеспячэння. Усе графікі работ узгоднены. На сённяшні дзень з 48 эксплуатацыйных участкаў пашпарты гатоўнасці ёсць на 14. Самы вялікі раён горада — Фрунзенскі — з пастаўленай задачай цалкам справіўся. Поўным ходам ідуць неабходныя работы па ўсім Мінску. Агульны працэнт атрыманых пашпартоў гатоўнасці па жылфондзе сталіцы складае на цяперашні момант 23 %. Па словах Цімафея Крэмеза, ацяпляльны перыяд пачнецца без праблем.

Узмоцненымі тэмпамі ідуць падрыхтоўчыя і рамонтныя работы на ЦЭЦ-2 і раённых кацельнях, а таксама на цепламагістралях. Па словах **дырэктара філіяла «Мінскія цеплавыя сеткі» РУП «Мінскэнерга» Аляксандра БУЗО**, на цеплакрыніцах рамантуецца цеплавое і дапаможнае абсталяванне з тым, каб да 15 верасня ўсе асноўныя работы былі скончаны.



Што датычыцца цеплasетак, то тут падрыхтоўка да асенне-зімовага сезона некалькі зацягнулася. Прычына аб'ектыўная: чэмпіянат свету па баскетболе сярод дзяўчат. З-за гэтага маштабнага спартыўнага свята тэрміны заканчэння работ крыху пасунуліся. Звычайна рамонт цепласетак заканчваецца да 1 верасня. Цяпер жа ён зацягнецца, хутчэй за ўсё, на месяц. Але, як адзначыў Аляксандр Бузо, у верасні ўсе работы будуць завершаны, адключэнні гарачай вады спыняцца, і асенне-зімовы перыяд горад сустрэне ў поўным узбраенні.

**Сяргей КУЛАКОЎ**

# «БЫЦЦАМ НА 20 ГАДОЎ ПАМАЛАДЗЕЛА»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Усяго ў храме, акрамя Вольгі, працуюць шэсць званароў. Цікава, што пяць з іх — жанчыны.

— Я прыходжу ў суботу ўвечары, у нядзелю ранкам і ў панядзелак ці аўторак. Каля храма стаяць дамы, і некаторыя жыхары абураюцца звону ў будны дзень. А я б з задавальненнем жыла побач і слухала, — дзеліцца жанчына.

Па адукацыі Вольга музыкант. «З дзяцінства любіла спяваць. Аднакласнікі мае пайшлі хто на архітэктурны факультэт, хто на ваенны, адна я на «культурку», — з усмешкай расказвае пра сваё паступленне ў Маскоўскі дзяржаўны інстытут культуры. Спачатку яна вучылася на харавым аддзяленні, пасля — з-за праблем з галасавымі звязкамі — перавялася на метадыста-арганізатара. Успамінае, што ў маладосці была вельмі актыўнай. Кіравала дзіцячымі харамі, ансамблямі, квартэтамі. А калі 30 гадоў таму выйшла замуж і пераехала ў Мінск, пайшла працаваць у школу — была настаўнікам па вакале і займалася музычным тэатрам, дзе паспела паставіць каля 30 спектакляў.

Кінуць работу прымусілі абставіны.

— У мяне маці з Данецкай вобласці. Калі там у 2014-м пачаліся ваенныя дзеянні, я забрала яе сюды. Мама была ляжачая. Я думала, буду сумяшчаць догляд і работу, але не атрымалася. Давялося звальняцца.

У званары Вольга прыйшла воляй выпадку. У гарадскім пасёлку Энергетыкаў (Дзяржынскі раён), дзе знаходзіцца яе лецішча, пабудавалі капліцку. Званіць не было каму. Папрасілі Вольгу: маўляў, ты музыкант, паспрабуй. Паспрабавала. І зразумела, што гэтаму трэба вучыцца, — запісалася ў школу званароў Мінскага Епархіяльнага ўпраўлення. Курсы там доўжацца чатыры месяцы.

— У многіх, хто вучыўся, не было музычнай адукацыі. І яны добра звоняць! Хоць, калі мы сальфеджыя праходзілі, ім, вядома, цяжэй было, — заўважае Вольга. І дадае, што на курсы запісваюцца людзі розных прафесій: спартсмены, медыкі, педагогі, будаўнікі, ваенныя.



Від на горад са званіцы.

У пасялковай капліцы Вольга звоніць раз на месяц — з мая па кастрычнік, калі пачынаюцца работы на лецішчы. А ў Свята-Петра-Паўлаўскі сабор папрасілася на работу, бо сама яго прыхаджанка.

— Я доўга саромелася, баялася званіць. Гэта ж такая адказнасць! — прызнаецца.

...Разам з Вольгай падымаемся ў званіцу. Вузенькі калідор, некалькі дзясяткаў прыступак, адна прыстаўная драўляная лесвіца, другая... Жартуем, што званар абавязаны мець не толькі добрае здароўе, але і зграбную фігуру — інакш не пралезеш.

На вуліцы больш за 20 градусаў цяпла, але на званіцы пранізвае вецер. «Калі халадае, абавязкова накідваю капюшон ці абвязваюся цёплай хусткай, — дзеліцца жанчына. — Неяк, калі стаяў моцны мароз, апранула дублёнку — а яна ж цяжкая, складана было падымаць рукі. Таму цяпер зімой апранаю маміну куртачку: яна, можа, не вельмі модная, але зручная».

Дарэчы, пры тэмпературы ніжэй за 15—18 градусаў званіць увогуле нельга: званы могуць раскалоцца.

З вышыні адкрываецца цудоўны від на горад.

— Вось на гэтай бярозе, — паказвае Вольга, — два гады запар птушкі вілі гняздо. Я са смартфонам толькі «пасябравала», усё з кнопачным тэлефонам хадзіла, а так бы сфатаграфавала іх.

Званоў тут дзевяць. Самы вялікі — Дабравест — Вользін любімы. Ці не пакутуе слых на такой рабоце? Жанчына задумваецца: не заўважала. У званіцы вісяць навушнікі, але Вольга абыходзіцца без іх.

З тым, што прафесія не зусім жаночая, суразмоўніца часткова згаджаецца:

— Калі я дырыжыравала хорам, адчувала сябе ўпэўнена. А тут... Мне здаецца, Бог дае тую сілу, якой не хапае жанчыне. Дый у мяне рукі лапатай натрэніраваныя. *(Усміхаецца.)* А ў гэтым годзе яшчэ з суседкай па лецішчы плаваць вырашылі — у нас там азярцо ёсць. Я 31 мая зайшла ў ваду першы раз і дагэтуль плаваю, калі прыязджаю, — ранкам і ўвечары. Нават у дождж. Але ў званара працуюць не толькі рукі — перш за ўсё мелодыя ідзе ад сэрца.

Да пачатку службы — пяць хвілін. Вольга нацягвае пальчаткі, каб рукі не слізгалі, і чытае малітву. Націскае на педаль — раздаецца працяглы ўдар Дабравеста. Цягне за тросікі — і падключаюцца іншыя званы. З твару жанчыны не сыходзіць усмешка, а ў нас з фатографам — мурашкі па целе.

— Кажуць, што да звону прывыкаеш, але для мяне ён кожны раз гучыць як па-новаму. Я адчуваю палёт, у мяне такая радасць на душы, — дзеліцца Вольга перажываннямі. — Вельмі люблю званіць на Крыжовых ходах. Адсюль такое відовішча адкрываецца: святары нясуць харугвы, людзі за імі ідуць, спяваюць...

Каноны ў звоне ёсць: напрыклад, у пост ён мусіць быць больш стрыманым. Але і свабода творчасці дазваляецца. Вольга ездзіла на фестывалі звону ў Салігорск, Хоцімск.

— Я вось сядзела і думала: чаму мяне так цягне да гэтага? Напэўна, справа ў тым, што я вельмі люблю пець, але ўзрост ужо не дазваляе выступаць у творчых калектывах. А тут разам са званамі душа запела.

Кажучь, звон лечыць. Суразмоўніца прызнаецца: за іншых казаць не будзе, але ёй дапамагае. За тыя гады, што працуе ў саборы, амаль забылася на ангіны і прастуды.

— Трымаюся. Не лічачы зморшчын, я ўнутрана адчуваю сябе маладой — быццам скінула 20 гадоў. Калі з іншымі званарамі сустракаемся (а сярод іх шмат маладых), увогуле на свой узрост не зважаю.

У Расіі ў некаторых храмах званароў мяняюць на робатаў (людзей, якія валодаюць азамі прафесіі, не хапае). Выбіраеш патрэбную мелодыю, націскаеш на кнопку на пульце кіравання — і аўтамат прыводзіць званы ў рух.

— Гэта вельмі бяздушна. Ну як званар можа да гэтага ставіцца? — уздыхае Вольга. — Вось я ездзіла на «Славянскі базар», паглядзела, як Ваенга выступае. І бачыла яе ўчора па тэлевізары. Той жа дуэт, але ёсць розніца!

Праўда, у Мінску званар таксама прафесія рэдкая. Летам, калі ўсе раз'язджаюцца, вельмі цяжка знайсці чалавека на замену.

У некаторых храмах званары атрымліваюць заробак, хай і невялікі. У Свята-Петра-Паўлаўскім саборы працуюць на добраахвотных пачатках.

— Напэўна, так і правільна. Гэта ж малітва, — разважае жанчына. — Я сама б даплачвала, каб званіць. Хочацца тут затрымацца даўжэй.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**




## НЕ ЗЛОЎЛЕНЫ, АЛЕ Ж ЗЛОДЗЕЙ?

Дзвюх суседак па дачы Таню і Галю аб'ядноўвала любоў да кветак. Стануць, бывала, ля агульнага плота і адна перад адной выхваляюцца, якіх насеялі, якія ўзышлі-расцвілі, а якія — яшчэ расцвітуць... У адной, вядома ж, прыгожыя, а ў другой яшчэ прыгажэйшыя, у адной новыя, а ў другой навейшыя. І шмат.

— Дзе ты іх толькі бярэш? — папыталася неяк Галя.

— Купляю, — пахвалілася Таня, — ды тыя грошы аддаю... Гаспадар дазнаецца — мала не падаса! Але ж мне на кветкі, на прыгажосць, анічога не шкада! І ты не бядуй, суседка, я з табой падзялюся — адкапаю карэньчыкаў, але ж потым, калі разрастуцца.

Тым часам адна вясна змяніла другую, кусцікі ўсё яшчэ падрасталі, калі неяк надвячоркам Галя згледзела суседку з рыдлёўкай.

— Ты куды гэта наважылася? — знячэўку спытала ў Тані.

— Ды пайду па вуліцах прайдуся. Пагляджу, дзе якія кветкі растуць, папытаю карэньчыкаў, — трохі разгубіўшыся, прызналася тая.

— Дык будны ж дзень. На дачах нікога няма, — здзівілася Галя.

— Ну мы ж з табой ёсць... І можа яшчэ хто стрэнецца... Я за грошы — не думай.

«Дык вось дзе ты «краму» знайшла?!» — усміхнулася Галя, ну ніяк прытым не чакаючы, што і ёй можа стаць не да смеху.

...Так атрымалася, што ў хуткім часе пасля гэтай размовы яна паехала з дачы: да сястры, на два тыдні.

А калі вярнулася, то кветнік свой ледзь пазнала: нехта выкапаў там (ці ўсё ж «выкупіў»?) самыя прыгожыя, самыя рэдкія кусцікі!

Пашкадаваўшы-паплакаўшы, гаспадыня хацела пайсці — пашукаць таго «пакупніка»? Але ж падумала: дзе ты яго знойдзеш? І галоўнае — як дакажаш?

...А злодзей, як ні дзіўна, «знайшоўся» сам — за блізкім плотам, дзе ў хуткім часе ва ўсю моц расцвілі знаёмыя кветкі!

Праўда, суседка ні імі, ні іншымі больш не хвалілася — нават размовы не заводзіла... Можа, таму, што і сапраўды нетактоўна гаварыць пра вяроўку ў доме павешанага?

**Раіса Васільева,**
*г. Падольск, Маскоўская вобласць.*

## У СТРАХУ ВОЧЫ ВЯЛІКІЯ...

Гэту гісторыю мая сваячка пачула на рабоце.

«Значыць, жыву я, — расказваў Максімавіч, — каля самай ракі, на высокім беразе, што, вядома ж, добра. А што, можа, не зусім: могілкі некалі паводдаль былі, аднак потым «разрасліся» — падступілі амаль да ганка.

Дык вось, неяк напрадвесні я ў светлым споднім (ноч таксама светлая была) па патрэбе выйшаў у двор. Унізе, каля самай вады, пачуў галасы, убачыў на беразе постаці — дзве. І адну з іх нават пазнаў.

— Грышка, здароў! — абазваўся зверху.

Той задраў галаву на мой голас.

— Ёсць закурыць? — папытаўся я.

Грыша ў адказ перахрысціўся, загнуў мацюка ды параіў:

— А ты ў сваіх папытайся. Там што — курцоў нямашака?

Я зразумеў, пра каго ён гаворыць, азірнуўся на могілкі і не вытрымаў — зарагатаў.

Сярод ночы мой смех і сапраўды загучаў досыць дзіка: узняўся да нябёсаў, потым спусціўся да рэчкі і яшчэ больш напужаў рыбакоў: яны кінулі ўсе свае прычындалы, рванулі наўцёк.

Мне таксама нічога не заставалася, як вярнуцца ў хату і легчы, але заснуць я болей не мог, бо па-ранейшаму хацелася курыць. Ды і сумленне даймала: напалохаў людзей.

Таму на досвітку я спусціўся да ракі, сабраў там параскіданы рыбацкі рыштунак — панёс да Грышкі.

— Прабач, — сказаў гаспадару (той, відаць, таксама не лажыўся). — Я вас ноччу спалохаў?

— Дык гэта быў ты?! — здзівіўся рыбак.

— Я... Курыць вельмі хацелася.

— Во... А мы ж цябе за здание прынялі — ва ўсім белым, на фоне крыжоў... Сябрук дагэтуль у шоку. Не паверыш: паспрабаваў курыць, — не змог. Як адрэзала!

...Выходзіць, што страх на карысць пайшоў?

Хто б мяне вось так напалохаў?»

**Дзіна Дубадзелава,**
*в. Леніна, Добрушскі раён.*

## СЛОВЫ? СІЛА!

У тыя ўжо далекаватыя часы сярод самых прэстыжных навучальных устаноў сталіцы была ВПШ — вышэйшая партыйная школа. І «хадзілі» ў яе, вядома ж, не дзеці — людзі дарослыя, часта — сямейныя, якія, як правіла, павышалі сваю кваліфікацыю.

Дык вось неяк раз двум такім навучэнцам (амаль дзядзькам) вельмі захацелася выпіць. Праўда, грошай на гэта, лічы, не было... А таму зайшлі яны ў суседні гастраном і маладзенькай дзяўчыне-прадавачцы паказалі свае чырвоныя пасведчанні.

Тая ў іх доўга не ўглядалася: прыняла мужчын за работнікаў народнага кантролю і кінулася да начальства.

Дырэктарка — грузная, сярэдніх гадоў жанчына — у прад'яўленыя пасведчанні таксама не глядзела: ёй, відаць, прывычней было задобрыць нязваных гасцей: запрасіць прысесці за стол, выпіць «па нейкіх пяць грамаў»...

— Вы што? На рабоце?! Ды ні ў якім разе! — сталі адмаўляцца «кантралёры».

Дырэктарка разгубілася.

Не лепш пачувалі сябе і «кантралёры», бо зусім не ведалі, як, з чаго трэба пачынаць праверку?

І тут на вочы Яўгену — высокаму, саліднаму — трапіла бочка з-пад рыбы. Стаяла яна ў падсобцы, у куце, нікому не замінала, але ж Яўген, папраўляючы акуляры, строга сказаў дырэктарцы:

— А бочкатара ў вас няправільна захоўваецца.

Заўвага «кантралёра», які выкарыстаў адмысловы тэрмін, яшчэ больш спалохала жанчыну. Яна зноў прапанавала свае «пяць грамаў».

— Добра, — палагадзеў Яўген, — можаце даць з сабой...

Узяўшы досыць важкі пакунак, мужчыны выйшлі з гастранома, рушылі ў інтэрнат. І ўжо там, разліваючы па шклянках прынесеную «Сталічную» ды закусваючы смачнай каўбасой, думалі, адкуль у Яўгенавым лексіконе з'явілася слова «бочкатара»? Бажыўся, што раней ён яго ніколі не чуў!

**Міхась Сліва,**
*г. Рагачоў.*

## СВЯТЛО ДАЛЁКАЙ... ЛЯМПАЧКІ

Летась Гродзенскаму дзяржаўнаму каледжу мастацтваў споўнілася 70! На святочныя ўрачыстасці з гэтай нагоды запрасілі і мяне — можа, таму, што адпрацаваў на ніве культуры звыш 35 гадоў, можа, таму, што некалі, да прызыву ў войска, вучыўся там. Усяго два месяцы, як быццам, а ўспамінаў... Да сёння! Але ж па парадку.

У школе я актыўна займаўся ў драмгуртку, вельмі любіў выступаць на сцэне. Карацей, настаўнікі раілі паступаць у Мінск, у тэатральна-мастацкі інстытут, што для мяне, вяскоўца з палескай глыбінкі, здавалася марай, прычым нерэальнай! А таму з багажом ведаў (сярэдні бал атэстата 4,8) і дваццаццю рублямі ў кішэні я (ну вядома ж, адзін) на перакладных (з перасадкай у Пінску) адправіўся ў Гродна.

Там пры паступленні ў культасветвучылішча (так называўся сённяшні каледж) трэба было паказаць сябе — прачытаць прозу, байку і верш. Я выбраў урывак з рамана Івана Мележа «Людзі на балоце», верш Рыгора Барадуліна «Трэба дома бываць часцей» і байку Эдуарда Валасевіча «Іншаземец» і атрымаў сваё першае «выдатна».

Экзамены па літаратуры і гісторыі таксама здаў паспяхова, а значыць (як сказалі потым аднавяскоўцы) Васіль Шчупакоў (гэта бацькава мянушка) паступіў-такі вучыцца на артыста.

Нашай навучальнай установай кіравоў тады Фелікс Феліксавіч Вронка, рэжысуру і майстэрства акцёра выкладаў народны артыст Беларусі, акцёр Гродзенскага драматычнага тэатра Якаў Кімберг. Мы бязмежна паважалі яго (іграў самога Леніна!), ды і нас амаль што адразу стаў выводзіць на сцэну, што сталася сапраўдным шчасцем, бо — апроч іншага — за ўдзел у спектаклі плацілі: кожны з так званай масоўкі атрымліваў па рублі.

Так мы вучыліся. І не менш цікава жылі: у інтэрнаце на Кірава, 33 віравала амаль сапраўднае багемнае жыццё — рэпетыцыі, спеўкі, спрэчкі, вячоркі...

Продавец – открытое акционерное общество «Щучинагропродукт», 231513, Щучинский р-н, д. Янчуки, 8-01514-411-79

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32, 45-05-38

Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 10 сентября 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя, и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 20.04.2018 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 4 сентября 2018 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению КЖРЭУП «Сельмашевское» (продавец) извещает о проведении 10 сентября 2018 года открытого повторного аукциона со снижением начальной стоимости по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| ПРИМЕЧАНИЕ: **стоимость имущества реализуется без учета НДС (в соответствии с п.п. 2.3 ст. 93 НК РБ).** Местонахождение имущества: **г. Гомель, пр-т Космонавтов, 15** | | | |
| 1 | **Автомобиль специальный техпомощь (фургон) марки ГАЗ-52-3201,** 1986 г. в., **рег. № 2063 ГСМ**, цвет – голубой, тип ТС – грузовой фургон, инв. № 104053, состояние – требует ремонта | 862,26 | 86,23 |
| 2 | **Автомобиль МАЗ 5551, 1992 г. в., рег. № ЕС 2561**, инв. № 5025, цвет – серо-белый, тип ТС – грузовой, состояние – требует ремонта | 4 406,29 | 440,63 |

**Продавец:** КЖРЭУП «Сельмашевское», г. Гомель, пр-т Космонавтов, 15. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (0232) 22 47 07 – Науменко Николай Владимирович. **Шаг аукционных торгов – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (КЖРЭУП «Сельмашевское»):** р/с BY21 PJCB 3012 4045 4310 0000 0933 в ОАО «Приорбанк» ЦБУ № 400, УНН 400052171, БИК PJCBBY2X, ОКПО 00642495, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 24 августа 2018 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 6 сентября 2018 г. в 16.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Подача документов по почте не допускается. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 30.05.2018 г. Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** На гэтым тыдні заканчваецца перыяд цяжкасцяў і стрэсаў, ужо да серады павінна наступіць прыкметнае паляпшэнне ў адносінах з Фартунай. Ёсць шанц атрымаць адабрэнне на рэалізацыю вашай ідэі ў начальства. У выхадныя ўвагі запатрабуюць дзеці падлеткавага ўзросту, магчыма, вы папярэдзіце іх не вельмі добрыя ўчынкі.

**ЦЯЛЕЦ.** Пачуццё няўпэўненасці і трывогі будзе перашкаджаць засяродзіцца на працы. Паверце, у вас больш сіл і ведаў, чым вы думаеце. Да таго ж інтуіцыя абвострыцца як ніколі, нават у больш чым нязвыклых сітуацыях вы беспамылкова выбераце правільную лінію паводзін. У канцы тыдня пасярод усеагульнай мітусні будзеце ўзвышацца, нібы нязломная скала, вашы спагада і аптымізм дапамогуць многім.

**БЛІЗНЯТЫ.** Пачатак тыдня — удалы час для рэалізацыі планаў і задум. У вас усё будзе атрымлівацца, лёгка знойдзеце аднадумцаў, спонсараў, заказчыкаў. Пажадана, каб эмоцыі не былі перашкодай у дзейнасці. Раскрываючы свой творчы патэнцыял, атрымаеце магчымасць умацаваць аўтарытэт, можа з'явіцца шанц заняць больш высокае становішча. У чацвер спрыяльныя паездкі, камандзіроўкі і пачатак падарожжаў. Не забывайце чаргаваць працу з адпачынкам. Асабістае жыццё парадуе.

**РАК.** Вы цяпер гаспадар ці гаспадыня становішча. Прыцягваеце і зачароўваеце навакольных, вас немагчыма не заўважыць, і ўдача на вашым баку. Вы ўнутрана настроены на пераўтварэнне і духоўнае аднаўленне. У панядзелак можа наваліцца мноства разнастайных, але дробных даручэнняў, так што пры неабходнасці звяртайцеся па дапамогу да калег. У канцы тыдня ўсё будзе спорыцца ў вашых руках, зможаце многае паспець. У пятніцу ўвечары паспрабуйце адпачыць, бо выхадныя будуць напоўнены падзеямі.

**ЛЕЎ.** Прытрымліваючыся стратэгіі супрацоўніцтва з усімі, хто толькі можа быць вам карысны, дамажэцеся поспеху. Будзеце сустракацца з цікавымі людзьмі і пазнаваць шмат карыснага для сябе. Актыўна дапамагаючы навакольным вырашаць праблемы, не забывайцеся і пра свае інтарэсы. Пажадана заняцца карэкціроўкай некаторых рысаў вашага характару, з ліку тых, што перашкаджаюць жыць. У чацвер прааналізуйце ход падзей і паспрабуйце зразумець, што не дае наладзіць асабістае жыццё.

**ДЗЕВА.** Аўторак — вельмі ўдалы дзень для заключэння здзелак і прасоўвання па кар'ернай лесвіцы. У сераду старанна правярайце ўсю інфармацыю, якая паступае да вас, ёсць вялікая верагоднасць недакладнасцяў і памылак. Паспрабуйце рэальна ацаніць свае сілы і не ўзвальвайце на сябе вялікі аб'ём працы. У нядзелю прысвяціце дастаткова часу сям'і.

**ШАЛІ.** Тыдзень прынясе ўдачу тым, хто прывык працаваць дакладна і зладжана, узгадняючы свае дзеянні з іншымі. Гэта, дарэчы, дапаможа вызваліць значную колькасць часу для асабістага жыцця. Так што смела прызначайце спатканне пасля работы. Прыліў сіл дапаможа справіцца з самымі складанымі заданнямі. У пятніцу можа адбыцца падзея, якая прымусіць перагледзець уласныя ідэалы, страсяне вас і абудзіць здольнасці, якія раней не прачыналіся.

**СКАРПІЁН.** Надыходзіць тыдзень, які запатрабуе хуткіх рашэнняў важных пытанняў. І зменіць жыццё да лепшага. Вас чакаюць цікавыя праекты, займальныя паездкі, важныя для кар'еры камандзіроўкі. Дзеці парадуюць сваімі дасягненнямі. Любы чалавек праявіць клопат і ўвагу.

**СТРАЛЕЦ.** На гэтым тыдні смела будуйце з сябрамі і членамі сям'і планы на будучыню. Многае ажыццявіцца. Абапірайцеся на старыя сувязі і правераных партнёраў. У сераду не пачынайце важных спраў, лепш прысвяціць гэты дзень выпраўленню памылак і недахопаў. У пятніцу ні ў якім разе не кідайце сваіх пачынанняў.

**КАЗЯРОГ.** На гэтым тыдні карысна будзе заняцца пашырэннем кола зносін, тым больш што магчымасць завесці новыя цікавыя знаёмствы ў вас напэўна з'явіцца. У аўторак зможаце праявіць сябе ў многіх галінах. У сераду ж, наадварот, лепш засяродзіцца на чымсьці адным, ды і з тым не вельмі спяшацца, выконваючы ўсё максімальна старанна і акуратна. У чацвер можаце занадта захапіцца даволі пустой справай або чалавекам.

**ВАДАЛІЎ.** На рабоце магчымы пазітыўныя перамены, і ў вас з'явіцца шанц прафесійнага росту. Аднак паспрабуйце не выхваляцца і не зазнавацца перад сябрамі і калегамі. Панядзелак — спрыяльны дзень для творчасці і новых ідэй. У чацвер паспрабуйце скончыць старыя справы і праекты. Добра было б урэгуляваць суботнія рознагалоссі з навакольнымі мірным шляхам.

**РЫБЫ.** З'явіцца шанц нарэшце ўзяцца за ажыццяўленне даўно задуманага. У сераду магчыма не зусім прыемная размова з начальнікам, але не варта асабліва перажываць, зоркі не пакінуць вас без заступніцтва. У пятніцу вас чакае цікавае знаёмства, паспрабуйце паказаць сябе з лепшага боку. Нядзеля можа быць азмрочана дробнымі непрыемнасцямі, але яны вельмі хутка забудуцца.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.03 | 20.19 | 14.16 |
| Віцебск — | 5.50 | 20.12 | 14.22 |
| Магілёў — | 5.53 | 20.09 | 14.16 |
| Гомель — | 5.54 | 20.02 | 14.08 |
| Гродна — | 6.19 | 20.34 | 14.15 |
| Брэст — | 6.23 | 20.31 | 14.08 |

## Месяц

*Першая квадра 18 жніўня.*
*Месяц у сузор'і Вадаліва.*

## Імяніны

**Пр.** *Аляксандра, Васіля, Максіма, Фёдара.*
**К.** *Маліны, Мальвіны, Міхаліны, Юрыя.*



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

# ЗАЎТРА




**Даты | Падзеі | Людзі**

**24 ЖНІЎНЯ**

**У краіне**

**960** год — меркаваная дата нараджэння Рагнеды Рагвалодаўны, полацкай князёўны, асветніцы. Дачка полацкага князя Рагвалода, жонка вялікага князя Уладзіміра Святаславіча, маці князя Ізяслава Уладзіміравіча. Паводле летапісаў, адхіліла сватанне Уладзіміра Святаславіча, які тады княжыў у Ноўгарадзе. Каля 980 г. Уладзімір захапіў Полацк і забіў бацьку, маці і двух братоў Рагнеды, а яе гвалтоўна зрабіў сваёй жонкай і даў ёй славянскае імя Гарыслава. З мэтай адпомсціць яна здзейсніла няўдалы замах на жыццё князя. Уладзімір саслаў жонку і сына, які заступіўся за маці, у горад Заслаўе. Згодна з паданнем, пасля хрышчэння князя і ліквідацыі яго гарэма Рагнеда адмовілася другі раз выйсці замуж і пастрыглася ў манашкі пад імем Анастасія. Памерла ў 1000 годзе.



**1928** год — нарадзіўся Янка (Іван Юльянавіч) Рамановіч, беларускі графік. Працаваў у станковай і кніжнай графіцы. Стварыў ілюстрацыі да паэм Я. Купалы «Магіла льва», «Зімою», партрэты беларускіх пісьменнікаў. У 1960—1974 гадах быў мастацкім рэдактарам часопіса «Маладосць». Памёр у 1974 годзе.

**У свеце**

**1572** год — у ноч на 24 жніўня ў Парыжы Кацярынай Медычы і прадстаўнікамі арыстакратычнага роду Гізаў была арганізавана масавая разня гугенотаў (французскіх пратэстантаў, кальвіністаў) католікамі (Варфаламееўская ноч).

**1938** год — у амерыканскай газеце «Крысчэн сэнчуры» быў упершыню выкарыстаны тэрмін «мыльная опера» ў адносінах да радыё- і тэлесерыялаў у жанры сямейнай меладрамы, якія ўвайшоў у моду ў канцы 30-х гадоў.

**1947** год — нарадзіўся Паўла Каэлья, вядомы бразільскі пісьменнік і паэт. Апублікаваў шаснаццаць кніг — раманы, анталогіі, зборнікі кароткіх апавяданняў-прыпавесцяў. У нас Каэлья праславіўся пасля выдання «Алхіміка» — твора, які доўга заставаўся ў першай дзясятцы бестселераў і які ўвайшоў у Кнігу рэкордаў Гінеса. Агульны тыраж на ўсіх мовах перавышае 300 мільёнаў.

**1948** год — нарадзіўся Жан Мішэль Жар, французскі музыкант, кампазітар, які працуе ў галіне электроннай музыкі. Аўтар яскравых музычных шоу з выкарыстаннем лазернай мультыплікацыі, піратэхнікі, галаграм, магчымасцяў навакольнага асяроддзя.

**1991** год — на сесіі Вярхоўнага Савета РСФСР прэзідэнт СССР М. С. Гарбачоў звярнуўся з прапановай аб самароспуску КПСС і заявіў аб складанні ім паўнамоцтваў Генеральнага сакратара ЦК КПСС.

## УСМІХНЕМСЯ

**Чаму летнія лагеры толькі для дзяцей? Можа, я ў свае 35 таксама хачу піцяразовае харчаванне, ціхую гадзіну, конкурсы ўсім атрадам і мядляк а 10-й вечара?**

У рэстаране.
— Вы крэдытныя карткі прымаеце?
— Так.
— І долары?
— Прымаем.
— А пустыя бутэлькі?

**Фразы, якія небяспечна прамаўляць:**
**«Ты не маеш рацыі» — у адрас жонкі.**
**«Я не хачу есці» — у адрас бабулі.**
**«Зрабіце на свой густ» — у адрас цырульніка.**

— Аня, ты заўсёды чуеш толькі тое, што хочаш!
— Віно з сырам? Вядома, буду!

**Google ёсць — розуму не трэба...**





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2993.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 23 жніўня 2018 года.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

24 жніўня 2018 г. № 34 (467)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ТЭМА ТЫДНЯ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ТРЭБА ДОМА БЫВАЦЬ ЧАСЦЕЙ...

Як вырашаецца праблема пустуючых дамоў на вёсцы

ПРАЦЯГ ТЭМЫ — на 3–15-й стар.

АКТУАЛЬНА

# У ЛЬГОТНЫМ СПІСЕ — НОВЫЯ ТЭРЫТОРЫІ

## На Міншчыне больш за чатыры тысячы сельскіх населеных пунктаў, дзе ёсць прэферэнцыі для прадпрымальнікаў

На пачатку жніўня адбылася сёмая сесія Мінскага абласнога Савета дэпутатаў, на якой разгледжана пытанне аб унясенні змяненняў у рашэнне Мінскага абласнога Савета дэпутатаў ад 23.11.2017 года № 235 «Аб мерах па рэалізацыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 22.09.2017 года № 345». Паводле дакумента ўнесены змяненні і расшыраны пералік сельскіх населеных пунктаў і тэрыторый па-за населенымі пунктамі, якія адносяцца да тэрыторый сельскай мясцовасці. Гэты пералік будзе ўключаць населеныя пункты ва ўсіх рэгіёнах Мінскай вобласці, за выключэннем горада Жодзіна. А таксама асобныя тэрыторыі ўздоўж аўтадарогі М4 (другая кальцавая дарога вакол Мінска, якая праходзіць па тэрыторыях Дзяржынскага, Валожынскага і Мінскага раёнаў). Прыняцце гэтага рашэння накіравана на стымуляванне дзелавой актыўнасці, прадпрымальніцкай дзейнасці, стварэнне спрыяльных умоў для развіцця гандлю, сістэмы грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання цэнтральнага рэгіёна. Дакумент дазволіць індывідуальным прадпрымальнікам, юрыдычным асобам ажыццяўляць рознічны гандаль, грамадскае харчаванне і бытавое абслугоўванне на тэрыторыях і ў населеных пунктах, вызначаных рашэннем, скарыстацца шэрагам ільгот, якія будуць садзейнічаць змяншэнню падатковай нагрузкі на ІП і юрыдычных асоб, і іншымі прэферэнцыямі. Гэта прывядзе да павелічэння колькасці суб'ектаў па абслугоўванні сельскага насельніцтва, стварэння дадатковых рабочых месцаў, паляпшэння бытавога і гандлёвага абслугоўвання сельскіх жыхароў.

Усяго ж на Міншчыне ў спісе больш за чатыры тысячы сельскіх населеных пунктаў, на якія распаўсюджваюцца льготы і прэферэнцыі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

**НАША ДАВЕДКА**

31 студзеня 2018 года прадпрымальнікам, якія працуюць у сферах гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання на вёсцы, у сярэдніх і малых гарадах дадзены льготы. Гэта прадугледжана Указам Прэзідэнта ад 22 верасня 2017 года № 345 «Аб развіцці гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання». Пад сельскай мясцовасцю маюцца на ўвазе населеныя пункты з сярэдняй колькасцю да дзвюх тысяч, пад сярэднімі і малымі населенымі пунктамі — адпаведна ад дзвюх да дзесяці тысяч чалавек.

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ


**У цэнтры ўвагі**



Рэалізацыю плана падрыхтоўкі законапраектаў абмеркавалі ў Савеце Рэспублікі стар. 2

**Будынак за 1 базавую**



За 10 гадоў на Гродзеншчыне прадалі больш за 500 пустых забудоў стар. 4,13

**Спаліць — ды ўсё!**



А якія варыянты ўтылізацыі трухлявых хат ведаеце вы? стар. 13

**Паўтары тысячы рабочых месцаў**



Стварылі на Гомельшчыне на аб'ектах, якія не выкарыстоўваюцца стар. 15

**Прывабнасць слынных мясцін**



На Ашмяншчыне рэалізуецца грамадская ініцыятыва па замацаванні моладзі стар. 16

КРАСНОАРМЕЙСКАЯ, 9



# ПЛОЩАДКА ОТКРЫТОГО ДИАЛОГА

*На V Форуме регионов Беларуси и России ожидается подписание контрактов на сумму около 500 миллионов долларов*

**Подготовку мероприятия обсудили на очередной встрече в Совете Республики. В этом году (что стало уже традицией) в работе форума примут участие главы государств.**

По словам председателя организационного комитета по подготовке и проведению V Форума регионов Беларуси и России Марианны Щеткиной, работа находится на завершающем этапе.



Фото БелТА.

— Основная задача встречи оргкомитета, которая проходит в настоящее время, — это оценить уровень готовности всех мероприятий. В первой половине сентября мы проведем совместный оргкомитет с Российской Федерацией. Это будет точка отсчета полной готовности нашего Форума регионов, — отметила Марианна Щеткина.

Главным событием форума станет пленарное заседание, которое должно определить приоритетные направления развития регионов. Союзное строительство — тема встречи Совета делового сотрудничества, который пройдет впервые.

— Мы запланировали обсуждение проблемных вопросов: это равные права субъектов хозяйствования, рынки без изъятия и ограничений, другие вопросы. Для представителей бизнес-сообщества, крупных предприятий, губернаторов должна быть площадка для открытого разговора, обсуждения проблем, чтобы потом вынести итог на пленарное заседание, — сообщила председатель оргкомитета.

Показателем результативности форума станет подписание соглашений. В работе сейчас находится около 50 соглашений, в том числе на уровне правительства Беларуси, региональных исполкомов и Минского городского исполкома.

Особое внимание будет также уделено и предложениям по совместным проектам в сферах науки и молодежной политики.

В формате видеомоста о готовности к мероприятию рассказали представители регионов Беларуси.

— Хочу сказать, что это не только мероприятия Совета Республики, Могилевских облисполкома и облсовета. Это Форум регионов, а значит, активное участие должно быть и Гомеля, и Гродно, и Бреста, и других регионов. И значит, соответственно должны работать региональные площадки, — обратился к участникам заседания **председатель Совета Республики Национального собрания Михаил МЯСНИКОВИЧ.**

Форум регионов на минувшей неделе стал темой совещания и в Белорусской государственной сельскохозяйственной академии в городе Горки. Подготовку международной научно-практической конференции «Аграрная политика Союзного государства: опыт, проблемы, перспективы» обсудили председатель Постоянной комиссии Совета Республики по региональной политике и местному самоуправлению Александр Попков, заместитель председателя Президиума НАН Беларуси Петр Казакевич, заместитель министра сельского хозяйства и продовольствия Игорь Брыло, руководители ряда научно-практических центров НАН Беларуси и Белорусской государственной сельскохозяйственной академии.

V Форум регионов Беларуси и России пройдет с 10 по 12 октября 2018 года в Могилеве. Участие в мероприятии примут более 2000 человек. В рамках события планируется работа пяти секций: аграрная политика, унификация и гармонизация законодательств, цифровая экономика, молодежная политика, международная деятельность и экономическая безопасность.

**Мария ДАДАЛКО.**

# ЗАКОНЫ ДЛЯ ЭКОНОМИКИ

**Пятая сессия шестого созыва Совета Республики Национального собрания Беларуси откроется 2 октября. На этой неделе сенаторы обсудили ход подготовки законопроектов, над которыми собираются работать осенью. «Обращаю внимание на то, что у нас были приняты все необходимые документы по организации работы с плановыми законопроектами. Поэтому настоящий президиум — это своего рода контрольное мероприятие», — отметил председатель Совета Республики Михаил МЯСНИКОВИЧ.**

Также он предложил рассмотреть вопрос шире. «Как обеспечивать выполнение Указа Президента Республики Беларусь от 10 января 2018 года «Об утверждении плана подготовки законопроектов на 2018 год». То есть не только те законопроекты, которые рассматриваются в Палате представителей, но и как в целом указ выполняется. Я почему на это обращаю внимание? Из материалов президиума следует, что пять законопроектов до сих пор правительством вообще не внесены в Палату представителей», — подчеркнул спикер. Эти правовые акты, в частности, касаются внесения изменений и дополнений в ряд законов, а также Закона «Об электроэнергетике».

Михаил Мясникович обратил внимание, что для успешной реализации программы социально-экономического развития на 2016—2020 годы требуется принятие 19 законов. Однако отметил, что «опять-таки три законопроекта Совет Министров не разработал вообще и не представил в установленном порядке в парламент».

По мнению председателя Совета Республики, в обществе существуют очень большие ожидания от реализации комплекса мер, предложенных в Декрете Президента «О развитии предпринимательства». Как рассказал Михаил Мясникович, Совет Республики предложил не только плановые мероприятия подготовки законопроектов в исполнение седьмого декрета, но и конкретные изменения по ряду нормативно-правовых актов. «Здесь также есть недоработки субъектов законодательной инициативы», — отметил спикер.

Еще одной темой для обсуждения стала подготовка законопроектов, по которым даны прямые поручения главы государства. Это, в первую очередь, касается изменений Гражданского и Налогового кодексов, а также Закона «Об инвестициях». Всего в законотворческом портфеле Совета Республики более 30 законопроектов. Дальнейшая работа над проектом Закона «Об изменении Гражданского кодекса Республики Беларусь», в частности,



Фото БелТА.

направлена на внедрение механизмов саморегулирования предпринимательской деятельности, устранение положений, потерявших свою актуальность, а также на унификацию гражданского законодательства Беларуси и России.

Что касается Налогового кодекса, Совет Республики предложил изменения, направленные на развитие предпринимательства и снижение налоговой нагрузки. В целом система должна быть простой и прозрачной для бизнеса.

В рамках работы над изменениями и дополнениями в Закон «Об инвестициях» верхняя палата парламента выступила с несколькими инициативами. Важно обеспечить уверенность потенциальных инвесторов в том, что Беларусь останется привлекательной для вложений в долгосрочной перспективе. Для этого предлагается ввести правило, что инвестор может работать на прежних условиях в течение определенного срока после изменения законодательства, ухудшающего его положение. При этом данное положение должно быть обеспечено судебной защитой. Кроме того, есть предложение развивать институт специальных долгосрочных инвестиционных договоров, чтобы гарантировать сбыт части продукции на внутреннем рынке на заранее оговоренных условиях.

«Считаю, что Совет Республики должен активнее работать с субъектами законодательной инициативы. Да, в течение года мы направили в республиканские органы государственного управления более 50 проработанных предложений, но считаю, что этого еще не достаточно. Надо активнее работать. И из того серьезного разговора, который состоялся в Орше, должны все сделать конкретные выводы. Всем надо совершенствовать стиль и методы своей работы. Парламенту в том числе», — резюмировал Михаил Мясникович.

Одно из стратегических предложений на ближайшие два года — подготовить соответствующую правовую базу и достичь в 2025 году ВВП в $100 млрд. Для этого наша экономика должна расти темпами, опережающими общемировые. Напомним, что в начале года Всемирный банк прогнозировал темп роста мировой экономики в 2018-м до 3,1 %.

**Надежда АНИСОВИЧ.**

## ❍ Комментарий в тему



Фото БелТА.

**Председатель Постоянной комиссии Совета Республики по законодательству и государственному строительству Виктор ЧАЙЧИЦ:**

— Сегодня для повышения качества жизни населения очень важно неукоснительно и своевременно выполнять требования Президента. И если глава государства наметил определенные законопроекты, то они продиктованы жизнью. И необходимо своевременно внести эти законопроекты на рассмотрение парламента. Конечно, важно, чтобы законы шли в ногу со временем. Два основных декрета, которые имеются у нас на сегодня, — «О развитии предпринимательства» и «О развитии цифровой экономики» — должны быть наполнены новыми законами, которые помогли бы реализовать самые важные прогрессивные моменты, отраженные в этих декретах.

Совет Республики заинтересован, чтобы все законы своевременно вносились на рассмотрение. Поэтому сегодня мы работаем в очень тесном контакте с Палатой представителей. И все вопросы, которые возникают, обсуждаем в рабочем порядке. Я считаю, и Палата представителей, и Совет Республики, конечно же, заинтересованы, чтобы все законы принимались своевременно.

Мы будем думать об изменениях в законы, которые помогут добиться такого амбициозного результата (ВВП в $100 млрд. — **Прим. «Зв.»**). А для этого надо создать все условия для развития предпринимательства и раскрепощения деловой инициативы, чтобы инновации активнее внедряли на каждом рабочем месте. И, конечно же, задача и парламента, и государственных органов власти создать условия для того, чтобы люди работали по-настоящему. Если мы будем работать спустя рукава, мы не достигнем таких результатов.

# ТРЭБА ДОМА БЫВАЦЬ ЧАСЦЕЙ...

**ГНІЛЫ плот, праселы дах, пустыя вокны, пустазелле з кінутых участкаў распаўзаецца-рассяваецца па суседніх агародах. І добра, калі яшчэ безгаспадарныя хаткі не аблюбавалі бяздомныя ці алкаголікі... Праблема забытых бацькоўскіх хат не новая. Праўда, сёння яе мала спісваць толькі на сумленне пасталелых дзяцей і ўнукаў, якія носу не сунуць на малую радзіму. Калі гаспадароў не знайсці, клопат пра «раскіданыя гнёзды» кладзецца на плечы дзяржавы. Вось толькі нягледзячы на прынятыя законы, справа з навядзеннем парадку на зямлі да гэтага часу не вырашана. Але сітуацыя павінна змяніцца.**

— Дзеючым Указам Прэзідэнта № 100 «Аб мерах па ўдасканальванні ўліку і скарачэнні колькасці пустуючых і старых дамоў у сельскай мясцовасці» ад 23 лютага 2012 года быў прапісаны алгарытм дзеяння ў дачыненні такога жылля. Але мясцовыя выканаўчыя камітэты недастаткова ўвагі ўдзялялі гэтай праблеме. Адна з перашкод для работы з пустуючымі дамамі — складанасць з пошукам уласнікаў. Дамы могуць быць незарэгістраваныя, звесткі пра іх у рэгістры нерухомасці адсутнічаюць, у сувязі з гэтым незразумела, куды слаць паведамленні. Шмат узнікала пытанняў з прэтэндэнтамі на такое жыллё, трэба было высвятляць, уступілі яны ў спадчыннасць ці не і якім чынам можна знайсці гэтых людзей. Згодна з указам, калі пасля паведамлення гаспадар не прыняў меры, то ён лічыцца чалавекам, які адмовіўся ад права ўласнасці на жылы дом. У гэтым выпадку мясцовы выканаўчы камітэт можа звяртацца ў суд для прызнання такой маёмасці без гаспадара камунальнай уласнасцю, — расказвае **намеснік начальніка юрыдычнага ўпраўлення Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Антаніна ТОРБІНА.** — Практыка паказвае, што мясцовыя выканаўчыя камітэты не ў поўным аб'ёме выкарыстоўваюць у рабоце са старымі і пустуючымі дамамі ўсе тыя заканадаўчыя рэсурсы, якія сёння існуюць. А гэта не толькі соты ўказ. Ёсць і другія нарматыўна-прававыя акты, якія дазваляюць сёння весці работу, вызначаць парушэнні, звязаныя з невыкарыстаннем пустуючых участкаў на працягу пэўнага тэрміну: Грамадзянскі кодэкс, Кодэкс аб зямлі. Таксама ёсць у нас і разбураныя дамы, па якіх заканадаўства дазваляе працаваць у зусім іншым кірунку. Ужо больш за два гады вядзецца работа па карэкціроўцы сотага ўказа, разглядалася праблематыка. Неаднаразова збіраліся прадстаўнікі мясцовых выканкамаў. У выніку выпрацавана ўзгодненая новая рэдакцыя ўказа, якая дазволіць вырашыць усе праблемы, якія абазначыла мясцовая ўлада.

## Дзе вы, гаспадары?

Часам і ёсць у кінутых хатак патэнцыйныя гаспадары. Вось толькі некаторыя з іх тояцца і да пары да часу не заяўляюць пра свае правы. Адна з прычын — нежаданне плаціць падаткі і несці цяжар па ўтрыманні гэтай маёмасці. Хтосьці баіцца страціць ільготы, якія можа атрымаць ад дзяржавы. Так не афармляюць спадчыннасць, калі стаяць на ўліку асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, паколькі пры вырашэнні пытання аб выдачы льготнага крэдыту такая інфармацыя будзе ўлічвацца.

— У дзяржавы няма мэты нічога забраць, трэба проста навесці парадак на зямлі. Закінутыя дамы часам садзейнічаюць крымінагеннай абстаноўцы. Усё, што патрабуецца ад уласнікаў — проста даглядаць свае дамы і зямельныя ўчасткі.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

> Выяўляцца «закінутыя гнёзды» будуць у першую чаргу на падставе візуальнага агляду. Іншымі словамі, калі гаспадары элементарна «падлаталі» хату і пакасілі траву, такі ўчастак ужо не трапіць у поле зроку камісіі.

Але Антаніна Торбіна ўпэўнена, што такія безгаспадарчыя адносіны часта звязаны і з нізкай прававой культурай грамадзян. Маўляў, калі дом належаў дзядам, бацькам, ён аўтаматычна пераходзіць да іх, і яны не звязваюць гэта з неабходнасцю афармлення. Такія людзі не заўсёды разумеюць і ведаюць пра ўсе наступствы, якія можа пацягнуць за сабой адсутнасць належным чынам афармленых дакументаў на маёмасць.

***— Калі ў патэнцыяльных гаспадароў проста няма грошай на афармленне, гэта ж не азначае, што яны могуць страціць сваю спадчыну?***

***— А калі спадчыннік не жадае працаваць на зямлі, ці можа ён напісаць адмову на такі дом?***

— Любы чалавек можа добраахвотна адмовіцца ад права ўласнасці на аб'ект, які яму належыць. Напрыклад, падаць пісьмовую заяву ў мясцовы выканаўчы камітэт. У той жа час асоба, якая на доўгі час выбыла ў іншы населены пункт ці нават іншую краіну і хоча захаваць за сабой такі дом, можа падаць паведамленне аб намеры па выкарыстанні маёмасці. Але такія ўласнікі павінны падтрымліваць участак і дом у належным стане. Магчыма, гаспадары (не толькі тыя, хто аформіў, але хто і не аформіў свае правы, у тым ліку спадчыннікі) не змаглі паклапаціцца пра дом з уважлівай прычыны. Зразумела, усё гэта павінна ўлічвацца.

## Як не страціць «радавыя гнёзды»?

Каб дом не запісалі ў безгаспадарныя, дзеючым указам трэба было выканаць такі крытэрый: чалавек павінен пражываць у ім на працягу апошніх трох гадоў у сукупнасці не менш як 30 каляндарных дзён у год. Калі гэты тэрмін быў меншы і ўласнік не паведаміў пра свой намер выкарыстаць жыллё для пражывання, дом падпадае пад дзеянне Указа № 100. Але як падлічыць гэтыя дні? І як даказаць, што на працягу трох гадоў хата так і прастаяла без гаспадара? Часам спадчынікі аб'яўляюцца са спазненнем і заяўляюць, што 2-3 гады таму «засвяціліся» ў родных пенатах. І тут выканкамы могуць патрапіць у складанае становішча. Асабліва, калі ў судзе ўжо было прынята рашэнне перавесці кінутую хату ў камунальную ўласнасць, а далей выканаўчы камітэт пажадаў знесці непрыглядны будынак. Якім чынам пакрыць кампенсацыю за знесены дом?

> Каб дом не запісалі ў безгаспадарныя, дзеючым указам трэба было выканаць такі крытэрый — чалавек павінен пражываць у ім на працягу апошніх трох гадоў у сукупнасці не менш як 30 каляндарных дзён. Калі гэты тэрмін быў меншы альбо ўласнік не паведаміў пра свой намер выкарыстаць жыллё для пражывання, дом падпадае пад дзеянне Указа № 100.

## Пошукам кінутых хат займаюцца спецыяльныя камісіі

Выяўляцца «закінутыя гнёзды» будуць у першую чаргу на падставе візуальнага агляду. Іншымі словамі, калі гаспадары элементарна «падлаталі» хату і пакасілі траву, такі ўчастак ужо не трапіць у поле зроку камісіі.

Расказаць, ці аб'яўляліся гаспадары, могуць і суседзі. А яшчэ гісторыю дома можна прасачыць і па розных матэрыялах, звязаных з абслугоўваннем будынка (камунальных плацяжах, страхоўках, падатках).

Калі ж пацвярджаецца, што ў дом гадамі не ступала нага чалавека, распачынаецца работа па працэдуры, прадугледжанай указам. Прымаюцца меры па вышуку ўласнікаў.

Калі ўласнік памёр, а ад прэтэндэнтаў на жытло нічога не чуваць, у кампетэнцыі мясцовага выканаўчага камітэта звяртацца ў натарыяльную кантору з запытам, ці не аб'явіліся там спадчыннікі. Нагадаем, што тэрмін уступлення ў спадчыну — шэсць месяцаў з моманту смерці спадчынадаўца.

## Перапіс будынкаў

— Праца над праектам вялася ўсебакова і не толькі датычыцца інтарэсаў дзяржавы, але і максімальна накіравана на забеспячэнне правоў і інтарэсаў уласнікаў такіх аб'ектаў, а таксама спадчыннікаў і іншых асоб, якія маюць правы валодаць і карыстацца гэтай маёмасцю (напрыклад, членаў сям'і, сваякоў, гаспадароў па дагаворы найму) і заявяць пра свой намер заняцца домам, — заўважае Антаніна Торбіна.

Пра лёс пакінутай бацькоўскай хаты можна будзе даведацца нават знаходзячыся далёка ад сваёй малой радзімы. Мясцовыя выканаўчыя камітэты будуць весці рэестр пустуючых дамоў і размяшчаць звесткі на сваіх афіцыйных сайтах, а таксама друкаваць там паведамленні аб вышуку патэнцыяльных гаспадароў.

Нават калі дом патрапіў у рэестр, у спадчыннікаў яшчэ ёсць магчымасць заявіць пра свае правы. Але патэнцыяльным гаспадарам трэба парупіцца, пакуль справа не дайшла да суда, дзе будзе прымаецца рашэнне аб прызнанні яго камунальнай уласнасцю.

Праектам прадугледжаны новыя падыходы і да дамоў, якія знаходзяцца ў аварыйным стане, пагражаюць абвалам. Кірунак работы з такімі дамамі будзе дэтальна рэгламентаваны.

Лёс пустуючых дамоў можа вырашацца па-рознаму. Яны будуць адчужацца і могуць быць захаваныя ў камунальнай уласнасці, замацаваныя за камунальнымі юрыдычнымі асобамі, альбо калі трымаць такія будынкі нэмэтазгодна, мясцовы выканаўчы камітэт можа прыняць рашэнне аб іх зносе. Могуць быць розныя варыянты іх адчужэння.

Праект указа дазволіць максімальна скараціць выдаткі мясцовага бюджэту пры рабоце з такімі дамамі.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

# НЕРУХОМАСЦЬ ПАВІННА «РУХАЦЦА»

**Пра праблемы ўцягвання ў гаспадарчы абарот аб'ектаў нерухомасці мы перыядычна паведамляем на старонках «МС». Дарэчы, і ў Еўропе ёсць аналагічныя праблемы: гадамі пустуюць жылыя дамы і збудаванні, якія раней выкарыстоўваліся ў камерцыйных мэтах. У ЗША ёсць нават кварталы без людзей. Адрозненне маленькай Беларусі ў тым, што тут імкнуцца зрабіць максімум, каб «мёртвых квадратаў» было як мага меней.**

Сёлета кіраўнікоў мясцовай улады абавязалі актыўна спрыяць эфектыўнаму продажу і арэндзе нерухомасці. У прыватнасці, старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарснёў патрабаваў ад народных выбраннікаў, старшынь раённых Саветаў асабіста ўнікаць у сутнасць пытанняў. Але не проста пазбавіцца ад «баласту», але, каб паралельна падтрымліваць ініцыятыву тых, хто хоча заняцца сваёй справай, развіць і пашырыць бізнес.

> Падчас маніторынгу высветлілася, што не ўсё нармальна з дзяржаўнай рэгістрацыяй аб'ектаў. Гэта не было зроблена на 50 % будынкаў, збудаванняў.

**Старшыня камітэта дзяржаўнай маёмасці Віцебскага аблвыканкама Віктар ЗАЙЦАЎ** агучыў праблемныя нюансы. Напрыклад, аблвыканкамам было даручана прадставіць у фонд дакументы для правядзення аўкцыённых таргоў па аб'ектах, запланаваных для адчужэння. Паводле інфармацыі на пачатак жніўня, рашэнні не прынялі па 15 са 194 аб'ектаў.

Як канстатаваў суразмоўнік, гэта — вынік нізкай выканаўчай дысцыпліны на месцах, нездавальняючага вядзення бухгалтарскага ўліку. І адпаведны падыход — вынік фармалізму пры правядзенні штогадовых інвентарызацый.

Падчас маніторынгу высветлілася, што не ўсё нармальна з дзяржаўнай рэгістрацыяй аб'ектаў. Гэта не было зроблена на 50 % будынкаў, збудаванняў. Асноўная колькасць пакінутых незарэгістраваных капітальных пабудоў — аб'екты арганізацый бюджэтнай сферы. Або тых, якія датуюцца з бюджэту, а таксама сельскагаспадарчых прадпрыемстваў.

У большасці выпадкаў гэтыя юрыдычныя асобы адчуваюць востры дэфіцыт фінансавых сродкаў, неабходных для задавальнення першачарговых патрэб, звязаных з іх непасрэднай дзейнасцю.

— Таксама адна з галоўных прычын праблем з нерухомасцю — адсутнасць дакументаў на зямельныя ўчасткі, выдзеленыя для абслугоўвання капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), якія падлягаюць дзяржаўнай рэгістрацыі. Аналагічнае датычыцца і незавершаных закансерваваных капітальных будынкаў, афармленне якіх таксама патрабуе значных фінансавых і часавых выдаткаў, — канстатаваў Віктар Зайцаў.

А бывае, што будаўніцтва вядзецца незаконна. Пракуратура Віцебскай вобласці знайшла парушэнні ў сферах самавольнага будаўніцтва і скарачэння колькасці пустуючых і старых дамоў.

Як паведаміла **пракурор аддзела па наглядзе за выкананнем заканадаўства і законнасцю прававых актаў Марына ЗАПРУДСКАЯ**, службовымі асобамі выканкамаў не заўсёды прымаліся меры па выяўленні і ліквідацыі фактаў самавольнага будаўніцтва, прыцягненні да адказнасці асоб, вінаватых у гэтых парушэннях заканадаўства. Парушэнні ўстаноўлены ў Лепельскім, Шаркаўшчынскім, Гарадоцкім раёнах, горадзе Віцебску. А ў Полацкім і Чашніцкім раёнах у парушэнне патрабаванняў не заўсёды ва ўстаноўленыя тэрміны ажыццяўлялі абследаванне самавольных пабудоў і падрыхтоўку неабходных дакументаў.

— У парушэнне патрабаванняў Указа Прэзідэнта № 100 неналежна вяліся рэгістры ўліку пустуючых дамоў. Выканкамы не валодалі поўнай і дакладнай інфармацыяй аб колькасці і месцы знаходжання названых аб'ектаў, у сувязі з чым не маглі належным чынам праводзіць з імі работу, — адзначыла Марына Запрудская.

Паводле яе слоў, былі і факты неадпаведнага фарміравання, а таксама бяздзейнасці камісій па абследаванні стану жылых дамоў у глыбінцы. Напрыклад, пракуратурай Лёзненскага раёна выяўлены шэраг старых і пустуючых дамоў, у дачыненні да якіх не прымалася рашэнняў аб уключэнні іх у рэгістр. І не вялося ніякай работы камісіяй райвыканкама па абследаванні стану жылых дамоў. Яны знаходзіліся ў неналежным стане, вакол — пустазелле...

На пазачарговай сесіі Віцебскага абласнога Савета было прынятае рашэнне накіраваць у раёны каля 100 тысяч рублёў на працяг зносу непатрэбнага жылля.

Пракуратурай Браслаўскага раёна таксама ўстаноўлены шматлікія пустуючыя і старыя будынкі, якія знаходзяцца ў напаўразбураным стане. І яны таксама не былі ўнесены выканкамам у адпаведны рэгістр. Нешта пачалі там рабіць толькі пасля ўнясення адпаведнага прадстаўлення ў райвыканкам.

> У парушэнне патрабаванняў Указа Прэзідэнта № 100 неналежна вяліся рэгістры ўліку пустуючых дамоў. Выканкамы не валодалі поўнай і дакладнай інфармацыяй аб колькасці і месцы знаходжання названых аб'ектаў, у сувязі з чым не маглі належным чынам праводзіць з імі работу.

Падобныя факты выяўлены таксама пракурорамі Глыбоцкага, Чашніцкага і Мёрскага раёнаў.

Выяўлены факты парушэння тэрмінаў падачы заяў у суды аб прызнанні дамоў безгаспадарнымі і перадачы іх ва ўласнасць адпаведных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак. Пракуроры ўнеслі ў мясцовыя органы ўлады дзевяць прадстаўленняў і тры прадпісанні.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# МАЁМАСЦЬ: ЭФЕКТУ

## Дзе мясцовыя ўлады а дзе

**ПРОДАЖ і арэнда пустых будынкаў за паўгода прыбавілі ў бюджэт Гродзенскай вобласці больш за 2 мільёны рублёў. За гэты час уцягнута ў абарот 74 аб'екты, што ў два разы больш, чым у папярэднія гады. Паспрыяе выніку як нарматыўна-прававая база, так і намаганні мясцовых улад. Разам з тым амаль сотня аб'ектаў працягвае гадамі вандраваць з аднаго графіка ў другі. А на іх утрыманне з таго ж бюджэту выдзяляюцца значныя сродкі.**

### «З малатка» — з выгадай

У Гродзенскай вобласці штогод прадаюцца і ўцягваюцца ў абарот дзясяткі аб'ектаў. Толькі за першае паўгоддзе абласным камітэтам дзяржаўнай маёмасці праведзена 84 аўкцыёны. У мясцовыя бюджэты ад продажу паступіла амаль 900 тысяч рублёў. Яшчэ амаль паўтара мільёна перайшло ў даход ад арэнды.

Некаторыя аб'екты ўдалося прадаць даволі выгадна. Напрыклад, вучэбна-вытворчыя майстэрні ў Смаргоні выстаўляліся за тры базавыя велічыні, а прададзены за 35 тысяч рублёў. У 500 разоў вышэй за стартавы кошт. Будынак кінатэатра ў Слоніме быў куплены за 120 тысяч, хоць спачатку выстаўляўся за 53 тысячы рублёў. Пустуючы будынак у Ашмянах прададзены за 134 тысячы замест 69. І такіх прыкладаў нямала, зазначае **старшыня абласнога камітэта дзяржмаёмасці Аляксандр ВІСКУБ.**

Як правіла, гэтымі плошчамі зацікаўлены прадпрымальнікі, якія разважаюць на іх сваю вытворчасць. Многія аб'екты выкарыстоўваюцца эфектыўна. У былым ваенным гарадку Гродзенскага раёна вядзецца перапрацоўка насення рапсу, занята 90 чалавек. Былую базу кансервавага завода ў Іўі набыў лідскі завод, зараз там наладжана вытворчасць сельгасмашын. У Мастоўскім раёне прадпрымальнік прыстасаваў пусты будынак пад вытворчасць поліэтыленавых вырабаў.

### Попыт залежыць ад рынку працы

Вядома, кожны гаспадар імкнецца прадаць сваю маёмасць як мага выгадней. Мясцовыя ўлады таксама імкнуцца папоўніць бюджэт. Разам з тым ёсць рызыка, што аб'ект можа прастойваць не толькі гады, але і дзесяцігоддзі. На месцах разумеюць, што значна большую выгаду прынясе аб'ект, які «працуе». Таму апошнім часам многія актыўна выкарыстоўваюць магчымасць продажу аб'ектаў за мінімальны кошт — адну базавую велічыню. Такім чынам за дзесяць гадоў прададзена больш чым паўтысячы пустых будынкаў.

Але менавіта з гэтымі аб'ектамі ўзнікае больш за ўсё негатыўных наступстваў. З-за безгаспадарчасці ўладальнікаў было скасавана 43 дагаворы, а памяшканні вернуты дзяржаве. Не заўсёды яны становяцца запатрабаванымі надалей. Пры гэтым у спіс штогод дабаўляюцца новыя аб'екты, якія цяжка прадаць, але шкада зносіць. Аляксандр Віскуб лічыць, што мясцовыя ўлады павінны ўзяць пад кантроль не толькі самі аб'екты, але і сітуацыю на рынку працы. Ён прывёў прыклад Свіслацкага раёна, дзе некалькі гадоў немагчыма прадаць былыя ўстановы адукацыі — дзіцячы сад, школу і комплекс школы-інтэрната. Усе аб'екты выстаўляліся за адну базавую некалькі разоў. І што характэрна — інвестары праяўляюць інтарэс да будынкаў і нават гатовы іх набыць, але наракаюць на недахоп рабочых рук, маўляў, хто там будзе працаваць?

Бізнесу трэба дапамагаць, упэўнены Аляксандр Віскуб. Бо бывае, што ўмовы дагавора выкананы, а рашэнні па іх у раёнах не прыняты.

— Трэба даць інвестарам новы імпульс, максімальна дапамагчы ім у наладжванні справы, а таксама па іншых пытаннях, каб новы інвестар працаваў і развіваўся, — лічыць старшыня камітэта дзяржмаёмасці.

### Чаму пустуюць кватэры?

Парадокс, але ў рэгіёне павялічваецца колькасць незаселенага дзяржаўнага жылля. Яго стан прааналізавалі ў Камітэце дзяржкантролю Гродзенскай вобласці. Аказалася, што за два гады незаселеныя плошчы выраслі ў два разы, аварыйны жылы фонд — амаль у тры разы, а колькасць жылля пад знос зменшылася толькі на 3,8 %.



# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

■ Тэлесеткі

## НА ТЭМЫ КУЛЬТУРЫ

**1 верасня на канале «Беларусь 3» пісьменнік Навум Гальпяровіч прадставіць свой новы аўтарскі праект «Суразмоўцы» — цыкл вялікіх інтэрв'ю з вядомымі пісьменнікамі, паэтамі, артыстамі, педагогамі і грамадскімі дзеячамі пра ролю роднай мовы ў фарміраванні грамадскай свядомасці, сучасны стан і праблемы беларускай літаратуры.**

У прэм'ерным выпуску, прымеркаваным да Дня беларускага пісьменства, гледачы ўбачаць сустрэчу з міністрам інфармацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Карлюкевічам. Далей праект будзе выходзіць у эфір кожную суботу.

Акрамя таго, юбілейнаму Дню беларускага пісьменства ў эфіры сацыякультурнага канала будзе прысвечаны паказ дакументальнай стужкі «Першадрук», знятага летась на «Беларусьфільме» да 500-годдзя айчыннага кнігадрукавання (яго гледачы ўбачаць 27 жніўня), і чатырохсерыйнага мастацка-публіцыстычнага фільма вытворчасці БТРК «Скарына. Дзеля Бога і людзей» (у праграме з 28 жніўня). А 2 верасня тыя, хто не зможа асабіста трапіць у Іванава на маштабнае свята, убачаць яго адкрыццё — музычна-тэатралізаваную дзею «Малой радзіме пакланюся» ■

■ На хвалі

## СЭЛФІ СА СПОРТАМ

**Больш як 80 арыгінальных сэлфі з розных краін свету ўжо дасланыя на конкурс творчых фотаработ «Мае прывітанне II Еўрапейскім гульням», абвешчаны Міжнародным радыё «Беларусь» сумесна з дырэкцыяй спаборніцтваў.**




На прапанову даслаць фотапрывітанне ўдзельнікам і гасцям Еўрапейскіх гульняў 2019 года адгукнуліся як беларускія аматары актыўнага ладу жыцця, так і жыхары Расіі, Украіны, Таджыкістана, Германіі, Фінляндыі, ЗША, Кітая, Індыі, Алжыра, Нігерыі і В'етнама. Напрыклад, адзін з актыўных слухачоў міжнароднага радыё «Беларусь» Дзітмар Вольф з Германіі даслаў калаж з лёгкаатлетычнага марафону ў Франкфурце, а кітаец Кевін Чжаа натхніўся гарналыжным цэнтрам у Пхёнчхане... Трапіць у спартыўную фотагалерэю і далучыцца да ўдзелу ў конкурсе могуць усе ахвотныя: для гэтага трэба ў тэрмін да 25 кастрычніка 2018 года зрабіць здымак на фоне спартыўных аб'ектаў, а яшчэ лепш — падчас уласных заняткаў спортам, пакінуць на ім пазнаку — хэштэг #MINSK2019 і даслаць на электронную пошту minskgames2019@gmail.com альбо далучыць да конкурснай заяўкі на сайце radiobelarus.by. «Умовы ў нас даволі жорсткія, ад кожнага ўдзельніка прымаецца толькі адно фота, — паведамілі на радыё, — але гэта таму, што прызы таго вартыя: пераможцы атрымаюць камплекты запрашальнікаў на спартыўныя мерапрыемствы Еўрапейскіх гульняў і парадную спартыўную экіпіроўку нацыянальнай каманды Беларусі!»

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК** ■

## ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 70

На дыяграме № 56 магчымы варыянт з партыі В. Дзярабін — Я. Кандрачэнка, якая гралася ў бліц-праграме на турніры «Белыя ночы — 2018» у Санкт-Пецярбургу. Беларускі гросмайстар у сваіх разліках задумаў прыгожую, нестандартную камбінацыю. Паспрабуйце адшукаць шлях да перамогі за чорных самастойна.

№ 56




**Белыя простыя шашкі:** b2, b4, c3, c5, d4, e3, f2, g5 (8).

**Чорныя простыя шашкі:** a5, a7, d6, d8, e7, f6, f8, h4 (8).

У шашкі-100 мініяцюры, складзеныя вядучым аддзела.

№ 57

**Белыя простыя шашкі:** 24, 25, 28, 30, 33, 42 (6).

**Чорныя простыя шашкі:** 7, 8, 9, 14, 15, 18 (6).

№ 58

**Белыя простыя шашкі:** 26, 31, 32, 40, 43, 44 (6).

**Чорныя простыя шашкі:** 12, 13, 14, 15, 23, 38 (6).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

У пачатку жніўня міжнародны гросмайстар Андрэй Валюк заняў другое месца ў чацвёртым этапе кубка свету па шашках-64 у Эстоніі ў Курэмаа.

З 10 да 12 жніўня ў Драгічыне адбыўся адкрыты рэспубліканскі турнір па шашках-64 «Етвызь 2018.» Перамог расійскі майстар Алег Холін (Бранск) — 14 ачкоў з 18 магчымых. На другім месцы кандыдат у майстры Сяргей Міцюта (Кобрын) — 13 ачкоў, трэцім фінішаваў майстар з Маладзечна Аляксандр Барташ — 12 ачкоў.

Праверце свае рашэнні: выпуск № 69 ад 10.08.18.

№ 52 d8. d2. b2. g5. d2. e1(b6) f2(a5) e1(g5) d2(h4) e1(b4) a5. b6(h2) g1+

№ 53 d8(c5A) c3(d2A1) fe7. g5. f4(c3)c1+ A(e7) f6. c3. d8. f4(c3) c1+ A1(e7) f6. d8. f4 (c3) c1+

№ 54 b2(e7) d8(d4) h2. f4. h8+

№ 55 1.47-42 (37x30 трэба біць большасць шашак і чорная застаецца простай) 2.35x02 (далей біць нельга, трэба чакаць ходу чорных) 32x43 3.02x38 43x32 4.4943+

Правільныя адказы даслалі В. Дударэвіч (в. Новая Мыш Баранавіцкага раёна), Ф. Карпей (Мядзел), В. Статкевіч (п. Зялёны Бор Івацэвіцкага раёна), В. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі, А. Ліцьвінаў (усе Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі раён), В. Бандарык (Мінскі раён).

**Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, газета «Звязда»; e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru**

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

■ Сядзі і глядзі

## ХУТКА Ў ШКОЛУ



### «Князёўна Мэры» TV1000 Kino RU, 27 жніўня

Безразважная гульня прапаршчыка Пячорына, які ад нудоты ў курортным Пяцігорску ўлюбляе ў сябе прадмет уздыханняў юнкера Грушніцкага, прыводзіць да трагічнага выніку... На экран трапіла ўсяго адна з частак рамана Лермантава «Герой нашага часу», а падстаў для роздуму яна пакідае безліч. Нездарма раман экранізавалі ажно пяць разоў, і гэта не ўлічваючы тэле- і радыёспектакляў. Словам, калі вашых старшакласнікаў не ўдаецца пасадзіць за «Героя нашага часу», прапануйце ім паглядзець «Князёўну Мэры». Для пачатку.

### «Каменная кветка» «МІР», 1 і 2 верасня



Уральскія сказы, памятныя многім яшчэ з сярэдніх класаў школы, зачароўваюць асаблівым рытмам і вобразамі, а фільм-казка Аляксандра Птушко, нягледзячы на шаноўны ўзрост (больш як 70 гадоў!), узмацняе ўражанне з дапамогай дэталяў і падрабязнасцяў. І вось яны нібы сыходзяць проста з кніжных старонак — Даніла-майстар, яго каханая Каця і Гаспадыня Меднай гары, якая спрабуе каштоўнымі камянямі ды сакрэтамі майстэрства засціць вочы і шлях назад, да людзей...



### «Аляксандр Неўскі» «Беларусь 3», 30 жніўня

І зноў у кадры школьная праграма — гэтым разам ажывае ўрок гісторыі. Гісторыя старажытнарускага князя, які ўшчэнт разбіў войскі Тэўтонскага ордэна на Чудскім возеры ў красавіку 1242-га, стала адной з найлепшых работ Сяргея Эйзенштэйна. Стужка, зробленая па дзяржаўным заказе, прынесла аўтару Сталінскую прэмію і ступень доктара мастацтвазнаўства, а ў гледачоў і ў даваенны час, і пазней мела ашаламляльны поспех, параўнальны хіба з «Чапаевым».

### «Пудзіла» ТВ3, 1 верасня



Гісторыя адной мужнай і самаахвярнай шасцікласніцы, якая змагла выстаяць у супрацьстаянні з чэрствасцю і жорсткасцю цэлага класа, знятая 35 гадоў таму, але актуальная і сёння. І, мабыць, сёння, у час татальнага дэфіцыту чалавечай цеплыні, нават больш, чым раней. Прысвячаецца не толькі дзецям, якія вучацца спазнаваць розныя адценні свету, але і ўсім дарослым, якія дагэтуль лічаць школьнае цкаванне, яно ж булінг, «дзіцячымі сваркамі» і што «самі разбяруцца».



### «Добры хлопчык» АНТ, 2 верасня

Вучань 9-га класа Коля Смірноў закахаўся ў настаўніцу англійскай мовы, а тым часам хтосьці падпаліў школьную прыбудову з новымі камп'ютарамі, тата прымусіў сям'ю жыць па рэжыме 12/36 (12 гадзін спаць, а потым 36 — займацца справамі), з-за чаго ва ўсіх татальны недасып, а тут яшчэ дачка дырэктара пачала заляцацца да самога Колі... У хлопца ёсць усяго некалькі дзён да свята школы, каб разабрацца з асабістым жыццём, наладзіць стасункі з бацькамі і выкрыць падпальшчыка. ■

■ Запрашальнік

## КАРАОКЕ З ГОРЦАМІ І НІНО КАТАМАДЗЭ

**1 верасня ў Мінску пройдзе ўжо чацвёрты па ліку фестываль грузінскай культуры «Тбілісоба», які ладзяць сумесна Мінгарвыканкам і мэрыя Тбілісі, пасольства Грузіі ў Беларусі, грузінская суполка «Мамулі» пры падтрымцы гандлёвай маркі «Баржомі».**

«У 2018 годзе Грузія адзначае 100-годдзе з дня абвяшчэння незалежнасці, і на «Тбілісобе» мы хочам падзяліцца з беларусамі сваімі галоўнымі дасягненнямі за стагадовую гісторыю, — расказаў **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Грузіі ў Беларусі Валерый КВАРАЦХЕЛІЯ**. — Таму гасцямі свята стануць легендарныя людзі, якіх любяць і паважаюць не толькі ў нашай краіне, але і ва ўсім свеце. У іх ліку мэр Тбілісі Каха Каладзе, у мінулым вядомы футбаліст кіеўскага «Дынама» і «Мілана», легендарны ансамбль песні і танцы «Эрысіёні», а таксама наогул Ніно Катамадзэ, чые канцэрты збіраюць тысячы прыхільнікаў у розных краінах».

Сярод іншых цікавінак фестывалю — не толькі музыка і танцы ад поўдня да поўначы, але таксама спіс са 100 спраў, якія дапамогуць бліжэй пазнаёміцца з гісторыяй і культурай Грузіі. Так, пра незвычайныя маршруты і спосабы правядзення водпуску раскажуць на першым «Турбазары» вопытныя падарожнікі і трэвэл-блогеры: як узабрацца на Казбек альбо зладзіць рафтынг па рэках, дзе знайсці традыцыйнае віно альбо зладзіць уласнае вяселле? Акрамя таго, на вялікай плошчы ад ратушы да набярэжнай Свіслачы можна будзе паўдзельнічаць у разнастайных актыўных забавах, сярод якіх караоке з горцамі на бэк-вакале, майстар-клас па труках на скейце і крэатыўная прычоска ў колерах грузінскага сцяга. Уваход на «Тбілісобу» традыцыйна вольны.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**



### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 1.05** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.45** «Зона Х». (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.20, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Добры хлопец». (16+).**
**12.45, 13.05, 14.35, 15.25 Меладрама «Аварыя». (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**21.00** Панарама.
**21.50** Спецыяльны рэпартаж. (12+).
**22.10 Серыял «След». (16+).**
**0.25** Арэна.
**1.25** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца. (12+).
**9.00, 18.30, 22.10** Тэлебарометр.
**9.30, 20.00 Серыял «Зразумець. Дараваць». (16+).**
**10.45** Капейка ў капейку. (12+).
**11.20** Камень, нажніцы, папера. (16+).
**11.55** «Спатканне для мамы». (12+).
**13.00** «Свет навыварат. Японія». (16+).
**14.05** М/с «Качыныя гісторыі». (0+).
**14.55** Анімацыйны фільм «Братка медзведзяня». (0+).
**16.25 Меладрама «Вострыя прыправы і страсці». (12+).**
**19.15** Суперлато.
**21.05** «Паненка-сялянка». (16+).
**22.05** КЕНО.
**22.15 Серыял «Улюбёнцы». (16+).**
**23.20** Хадзі сюды і танцуй.
**23.25** «Вярніце мне прыгажосць». (16+).
**0.50** Сыграй мяне, калі зможаш. (12+).

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.20** «Беларуская кухня». Мяса ў цесце.
**8.05, 12.00, 19.55** Навіны культуры.
**8.20, 12.15** Гэты дзень.
**8.25** «Нацыянальны хіт-парад».
**9.15, 18.00** «Апошні дзень». Глеб Стрыжэнаў (12+).
**9.55** «Навукаманія» (6+).
**10.20 «Тайна Бургундскага двара». Драма (12+).**
**12.50** «Наперад у мінулае».
**13.20** «Першадрук». Дак. фільм (12+).
**13.55, 21.05 «Вызваленне». Кінаэпапея. «Вогненная дуга» (12+).**
**15.25, 22.35** «Вызваленне». «Заходне-Карпацкая наступальная аперацыя» (12+).
**15.50 «Аты-баты, шли солдаты...» Маст. фільм (12+).**
**17.15** «Апошні дзень». Глеб Стрыжэнаў (12+).
**17.55 «Фрыда». Драма (16+).**
**20.10** «Майстэрня. Гісторыя аднаго мастака». Аляксей Мартынаў.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.00** «Беларусь як песня». Анатоль Падгайскі.

### Беларусь 5

**6.55** Веславанне на байдарках і каноэ. Чэмпіянат свету.
**8.20** Вынікі тыдня.
**9.00** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. ФК «Гомель» — «Дынама-Мінск».
**10.55** Вялікі спорт.
**11.35** Воднае пола. Чэмпіянат Еўропы — 2019. U-19. Беларусь — Румынія.
**12.50** Піт-стоп.
**13.20** Пляжны футбол. Чэмпіянат Беларусі. Фінал.
**15.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ліверпуль» — «Брайтан».
**17.50** Мастацкая гімнастыка. Чэлендж-кап. Казань.
**18.55** Спорт-цэнтр.
**19.05** Воднае пола. Чэмпіянат Еўропы. U-19. Грэцыя — Беларусь.
**20.20** Час футбола.
**21.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**22.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Юнайтэд» — «Тотэнхэм». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.10, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**9.10** «Контуры!».
**10.00** «Жыць здарова!» (12+).
**11.10** «Кантрольная закупка» (12+).
**11.50** «Модны прыгавор» (12+).
**13.10 Серыял «Браты Карамазавы» (12+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+).
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.30, 18.20, 0.10** «На самай справе» (16+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** «Час».
**21.10 Серыял «Шпік» (12+).**
**23.10 Серыял «Курортны раман» (16+).**
**1.05** «Начныя навіны».

### СТБ

**5.30** «Вялікі горад».
**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**6.10, 20.15** «Меншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца». Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 19.55, 23.00** «СТБ-спорт».
**9.05** «Скардзіцца дазваляецца».
**9.25** «Тыдзень».
**10.40 «Водблiскi». Серыял. Заключныя серыі (16+).**
**13.10** «Вадзіць па-руску» (16+).
**13.45** «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).
**14.40, 22.15** «Глядзець усім!» (16+).
**14.50** «Легенды СССР» (16+).
**15.45, 16.50 «Інструктар». Серыял (16+).**
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.25 «Крэмень». Серыял (16+).**
**23.05** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**23.40** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**0.25** «Мінтранс» (16+).
**1.10 Трылер «Прыстанак праклятых». (18+).**

### МІР

**6.30** «Культ/Турызм» (16+).
**6.50 Маст. фільм «Ласкавы май» (16+).**
**9.00, 1.05** «Зала суда. Бітва за грошы» (16+).
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**10.05 Серыял «АСА» (16+).**
**10.50, 13.15 Серыял «Агент нацыянальнай бяспекі-4» (16+).**
**14.00, 2.00** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.00, 3.00** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 0.10** «Гульня ў кіно» (12+).
**17.10 Серыял «Вяртанне Мухтара-2». (16+).**
**19.20, 3.55 Серыял «Кодэкс гонару». (16+).**
**22.05 Маст. фільм «Блажэнная» (16+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**12.50, 14.35 Маст. фільм «Саўдзельнікі» (12+).**
**13.35** «Наша справа» (16+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.35** «Лёс чалавека». (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**20.40 Серыял «Чаўночніцы». (12+).**
**23.10 Серыял «Маскоўская барзая». (12+).**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.50** Сёння.
**6.10 Серыял «Чорная павуціна». (16+).**
**10.25 Серыял «Пчаляр». (16+).**
**13.25, 18.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05, 16.35 Серыял «Мянтоўскія войны». (16+).**
**17.25** «ДНК». (16+).
**19.45 Серыял «Пёс». (16+).**
**21.35 Серыял «Шэлест. Вялікі перадзел». (16+).**
**23.25** «НЗ.by».
**0.05 Серыял «Сведкі». (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.55, 19.15, 21.00, 0.55** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**7.15, 0.05 Серыял «База» (16+).**
**8.10 Серыял «Цяжкі пясок» (16+).**
**9.10 Серыял «Сям'я» (16+).**
**10.10** Здароўе.
**11.00, 17.45 Серыял «Сакратар» (16+).**
**12.30 Фантастыка «Зялёная пчала» (16+).**
**14.25 «Героі коміксаў на экране». Камедыя «Гарфілд» (12+).**
**16.00** «Мультпарад» (0+).
**16.10** Дак. фільм «Малыя» (0+).
**16.50 Серыял «Турэцкая для пачаткоўцаў» (16+).**
**19.20 Серыял «Вер» (12+).**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Трылер «Вялікае аграбленне цягніка» (16+).**



### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер» (16+).
**7.00** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**7.40, 0.10** Серыял «Татавы дочкі» (12+).
**9.00, 3.00** М/ф «Тры каты» (0+)
**9.25, 3.20** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**9.50, 3.40** М/ф «Наватар» (6+)
**10.15, 19.20** «Уральскія пельмені» (16+).
**11.30** «Проста кухня» (16+).
**12.00** «Паспець за 24 гадзіны» (16+).
**13.00** Серыял «Беглыя сваякі» (16+).
**15.10** Камедыя «Астэрыкс і Абелікс у Брытаніі» (12+).



**17.20** Анімацыйны фільм «Дазор джунгляў» (6+).
**21.00** Камедыя «Аднакласнікі-2» (12+).
**23.10** Серыял «Мільёны ў сетцы» (16+).
**2.20** «Ералаш» (6+).
**3.40** «Лаві момант» (16+).
**5.00** «Дурні і дарогі» (16+).

### Культура

**6.30, 15.50** «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
**6.50** «Памылка інжынера Кочына». Маст. фільм.
**8.40** «Адважны кравец». «Брэменскія музыканты». «Па слядах брэменскіх музыкантаў». М/ф.
**10.15, 1.55** «Звычайны канцэрт».
**10.45** «Маляўкін і кампанія». Маст. фільм.
**12.55** Невядомая Еўропа. «Людвіг Другі: вар'яцтва або імкненне да святасці?»
**13.25, 1.55** «Дынастыя дэльфінаў». Дак. фільм.
**14.10** «Касабланка». Маст. фільм.
**16.05** «Пешшу...» Масква бібліятэчная.
**16.35** Па слядах тайны. «Неверагодныя артэфакты».
**17.20** «Песня не развітваецца... 1976—1977 гады».
**18.50** «Справа «пярэстых». Маст. фільм.
**20.30** «Сіта і Рама». Серыял.
**21.50** Каханне ў мастацтве. «Мэрылін Манро і Артур Мілер». Дак. фільм.
**22.40** «Шэдэўры сусветнага музычнага тэатра». Опера-буфа В. А. Моцарта «Вяселле Фігара» на Зальцбургскім фестывалі.
**2.40** «Зніклы аркестр». М/ф для дарослых.

### Настальгія

**6.15** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1967. 1-я частка. 2008 год (12+).
**7.25, 8.35, 9.45, 11.00, 13.40, 19.20, 20.45, 2.30, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.45** «Шынок «13 крэслаў». 1970 год (12+).
**9.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00** «Колба часу» (16+).
**11.10, 17.00, 23.10** «Песня-85». (12+).
**12.00** Маст. фільм «Вясна». (12+).




**14.00** «Погляд». 1989 год (16+).
**15.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**16.00** Маст. фільм «Міг удачы». (16+).
**18.00** «Вакол смеху». Тэма: «Казачны вечар». 1981 год (12+).
**19.30** «Што? Дзе? Калі?» Фінальная гульня 1985 года (тайм першы) (12+).
**21.00** Маст. фільм «Кропка вяртання». (16+).
**0.00** Фільм-спектакль «Маленькія камедыі вялікага дома». 1974 год (12+).
**4.00** «Народжаны ў СССР» (12+).
**5.00** «Рытмы планеты». 1985 год (12+).

### EuroSport 1

**4.00, 6.00, 8.00, 10.00, 19.00, 22.15, 0.00, 2.15** Тэніс. US Open.
**11.30, 13.00, 16.00** Веласпорт. «Вуэльта».
**18.45** Веласпорт. «Вуэльта»-экстра.
**22.00, 2.00** Тэніс. «Гейм, Шэт і Матч».

### Кінакамедыя

**1.35** Па версіі Барні (16+).
**4.10** Пад маскай жыгала (16+).
**5.55** Супер Брыс (12+).
**7.35** Спытайце ў Сіндзі (16+).



**9.25** Заліковы выкладчык (16+).
**11.45** Заліковы выкладчык-3 (16+).
**14.10** Кароль вечарынак (16+).
**16.00** Мілка (18+).
**17.40** Старая добрая оргія (16+).
**19.30** Змешаныя пачуцці (16+).
**21.10** Неваляшка (16+).
**23.00** Галівудскія копы (12+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**9.45** «Паненка і кулінар» (12+).
**10.20** «Паехалі» (12+).
**10.55, 1.45** «Вікторыя». Серыял (16+).
**14.40** «Жонка. Гісторыя кахання» (16+).
**16.00** «Вар'яцтва. Плата за талент». Дак. фільм (12+).
**16.55** «Ціхія людзі». Дэтэктыў (12+).
**20.30** «Без падману» (16+).
**21.25** «Атэль «Мэрыголд». Засяленне працягваецца». Трагікамедыя (12+).
**23.45** «Асцярожна, махляры!» (16+).
**0.15** «Грань». Серыял (16+).
**5.05** «Нераскрытыя тайны» (12+).

### ТБ1000

**6.10, 17.50** Тата-дасвідос (16+).
**8.30** Жудасна гучна і занадта блізка (16+).
**11.05** Рамэа і Джульета (12+).
**13.30** Трынаццаць сяброў Оўшэна (16+).
**15.55** Монстры на канікулах (6+).
**20.10** Хуткі і мёртвы (16+).
**22.15** Мой хлопец — псіх (16+).
**0.35** Да нечага выдатнага (18+).
**2.25** Ідэальныя незнаёмцы (16+).
**4.00** Эд з тэлевізара (12+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Службовы раман. Наш час (16+).
**8.10** Мамы (12+).
**10.15** Цяжкі выпадак (16+).
**12.25** Дон Сезар дэ Базан. 2-я серыя (0+).
**13.50** Канікулы прэзідэнта (16+).
**16.00** Дама Пік (16+).
**18.20** Горад. (16+).
**20.20** 28 панфілаўцаў (12+).
**22.40** Тэрмінова выйду замуж (16+).
**0.45** Вучань (18+).
**2.55** Суперменеджар, або Матыка лёсу (16+).



**4.25** Гідраўліка (16+).

### National Geographic

**6.00, 15.40, 17.35, 19.35, 21.35, 5.40** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**6.25** Дзікі тунец. (12+).
**8.45** «Зялёныя героі» Джэкі Чана. (16+).
**9.30, 12.30** Неверагодны доктар Пол. (16+).
**13.20, 4.05** Расследаванні авіякатастроф. (16+).
**18.00, 22.00** Асушыць акіян. (16+).
**23.35, 1.50, 3.20** Сапраўдны геній. (12+).

### Discovery

**8.00** Як гэта ўстроена?
**11.00, 2.00** Чыгунка Аўстраліі.
**12.00, 1.00** Скарб Купера.
**13.00** Голыя і напалоханыя.
**14.00** Зорнае выжыванне.
**15.00** Мяцежны гараж.
**16.00** Металаломшчыкі.
**17.00, 19.30** Паляўнічыя на склады.
**20.00** Махінатары.
**23.00** На краі зямлі.
**0.00, 7.10** Вулічныя гонкі.
**2.55** Найлепшы мадэліст.
**3.50** «Боні: рускі рэкорд на саляным возеры».
**4.40** Круты віраж Аарона Каўфмана.

*У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена.*

# ЯК ПАЗБЕГНУЦЬ ТРУБЫ?

## папаўняюць бюджэт, страчваюць

Між тым утрыманне старога фонду абыходзіцца нятанна. Толькі ў Гродне, дзе самы вялікі незаселены жылы фонд, на гэта ідзе 30 тысяч рублёў штогод. Большасць будынкаў знаходзіцца ў гістарычнай частцы горада, дзе ўчасткі маюць высокі кадастравы кошт, але меры не прымаюцца па 5—10 гадоў. У выніку — жыллё прыходзіць у занядпад.

— Незаселенае жыллё — гэта неабгрунтаваныя расходы бюджэту, і да яго будзем ставіцца як да дзяржаўнай маёмасці з усімі адпаведнымі наступствамі, — падкрэсліў **старшыня Камітэта дзяржкантролю Гродзенскай вобласці Анатоль ДАРОЖКА.** — І калі жылы фонд не захоўваецца належным чынам, трэба падлічыць нанесеныя страты і прыцягнуць да адказнасці тых, хто гэта дапусціў.

Гарадскія ўлады згодны з тым, што работа па скарачэнні незаселенага і аварыйнага жылога фонду ідзе марудна. Як растлумачыў **намеснік старшыні Гродзенскага гарвыканкама Андрэй БОЛТРЫК**, ёсць спадзяванні на продаж аварыйных аб'ектаў. Але, каб выставіць іх на аўкцыён, трэба перавесці жылыя памяшканні ў нежылыя, а гэта марудны працэс, бо ён закранае інтарэсы людзей, якія там зарэгістраваны. Таксама немагчыма перавесці жылыя памяшканні ў нежылыя, калі няма аўтаномнага выхаду. Гэту праблему можна ўрэгуляваць толькі на ўзроўні заканадаўства. Дзе такіх перашкод не было, усе памяшканні рэалізаваны, запэўніў Андрэй Болтрык.

Вядзецца работа па зносе старых будынкаў. Тры з шасці запланаваных ужо знесена. Разам з тым тут імкнуцца максімальна захаваць гістарычны цэнтр і яго драўляны квартал Новы свет, таму адмовіліся ад зносу некалькіх дамоў, а прапануюць іх інвестару.

Дзяржаўныя кантралёры выявілі і такі факт: даныя аб наяўнасці пустуючага жылога фонду гарвыканкама і статыстыкі не супадаюць. Прычым такая сітуацыя склалася ва ўсіх раёнах. Гэта сведчыць аб тым, што на месцах не забяспечваецца інвентарызацыя дзяржаўнай маёмасці і яе ўлік. Гэта, у сваю чаргу, не дазваляе мясцовым органам самакіравання прымаць эфектыўныя кіраўніцкія рашэнні па выдзяленні сродкаў на добраўпарадкаванне жылога фонду. Таму многія і не засяляюцца ў такія дамы, асабліва ў сельскай мясцовасці.




### Закон у дапамогу

Сітуацыя з пустуючымі аб'ектамі ў вобласці не самая горшая. Не уцягнуты ў абарот 1,8 % усяе камунальнай уласнасці. У цэлым па краіне гэты паказчык на 1 красавіка складае 2,5 %. Планы па скарачэнні колькасці пустых будынкаў у вобласці з кожным годам растуць.

Сёлета неабходна ўцягнуць у абарот 103 аб'екты камунальнай уласнасці. Яшчэ амаль 70 перайшлі з папярэдніх гадоў і будуць выстаўляцца альбо за адну базавую велічыню, альбо з паніжэннем да 80 %. У камітэце дзяржмаёмасці раяць смялей падыходзіць да работы па ўвядзенні пустуючых аб'ектаў у гаспадарчы абарот.

— У нас няма абавязацельстваў, якія б дэпутаты не змаглі «разруліць» згодна з нарматыўна-прававой базай. Бадай што па кожным аб'екце ёсць шляхі вырашэння. Асобную ўвагу варта звярнуць на аб'екты, якія не прададзены за апошнія тры гады, — адзначае Аляксандр Віскуб.

Радыкальныя меры патрэбны ў тых раёнах, дзе многа пустуючых будынкаў. У Гродзенскай вобласці гэта горад Гродна, Шчучынскі і Свіслацкі раёны. Камісіям на месцах важна вызначыць далейшы кірунак работы па ўцягванні ў абарот пустых будынкаў, бо іх колькасць павялічваецца і з імі трэба нешта рабіць. Ідзе аптымізацыя дзіцячых садоў, школ, клубаў у сельскай мясцовасці. На баланс райвыканкамаў перадаюцца аб'екты рэспубліканскай уласнасці. Трэба быць гатовымі, каб вырашыць іх далейшы лёс. Тым больш што прававая база ў гэтым кірунку ўдасканальваецца. Так, летась з'явіўся ўказ, які дазваляе спісваць страты за кошт дадатковага капіталу пры перадачы аб'ектаў спажыўкааперацыі. А яны складаюць значную долю пустуючых будынкаў, напрыклад у Карэліцкім раёне іх больш за 20. Многія даўно закінуты і зараслі бур'янам.

> Незаселенае жыллё — гэта неабгрунтаваныя расходы бюджэту, і да яго будзем ставіцца як да дзяржаўнай маёмасці з усімі адпаведнымі наступствамі. І калі жылы фонд не захоўваецца належным чынам, трэба падлічыць нанесеныя страты і прыцягнуць да адказнасці тых, хто гэта дапусціў.

Спрацсіўся і працэс бязвыплатнай перадачы маёмасці ад аднаго дзяржаўнага ўласніка да другога. Цяпер пры перадачы на баланс не трэба рабіць рыначную ацэнку. Ёсць «паслабленні» для непрывабных для інвестараў аб'ектаў. У прыватнасці, былых ваенных баз некаторых раёнаў вобласці. Пасля адабрэння Мінабароны, МНС і іншымі ведамствамі, абласны Савет дэпутатаў зацвердзіў пералік аб'ектаў, якія можна не ўключаць у гаспадарчы абарот. Але яны павінны мець агароджу і не ўяўляць небяспекі для наваколля.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

ДУМКІ ЎСЛЫХ

# АДЗІНОТА ПАКІНУТАЙ ХАТЫ

**Не раз даводзілася пісаць пра выкананне сотага ўказа ў розных населеных пунктах. Варта сказаць, што ў многіх раёнах назапашаны цікавы вопыт гэтай работы, асобныя сельсаветы могуць пахваліцца неблагімі поспехамі ў справе навядзення парадку.**

А некалькі гадоў таму аўтар гэтых радкоў выязджала ў адзін з сельсаветаў Камянецкага раёна па скарзе. Сын 85-гадовай вясковай жыхаркі напісаў ад яе імя, што ў іх вёсцы нічыйную хату спалілі супрацоўнікі райаддзела МНС. Так яно і было. Старшыня сельскага Савета расказала, што гаспадары пустога дома даўно паўміралі, з нашчадкаў засталася іх унучка, якая напісала адмову. Такім чынам былое жыллё трапіла ў спіс нічыйных. Пасля праўядзення вызначаных заканадаўствам працэдур сельвыканкам заключыў дагавор з аддзелам МНС. Яго супрацоўнікі прыехалі на месца, знялі шыфер з даху, вынялі вокны, сцены разабралі, драўніну спалілі. Потым факт пацвердзіў і начальнік райаддзела пажарна-выратавальнай службы. Ён яшчэ сказаў: «Мы ж не спальваем, як захопнікі калісьці, пра якіх згадвалі бабулі. Тыя падпальвалі хату з чатырох бакоў ды з'язджалі. Мы спачатку прапаноўваем бярвенні на дровы насельніцтву. А ў той вёсцы і прапаноўваць не было каму... Звычайна мы спальваем непрыдатныя для выкарыстання драўляныя рэшткі, захоўваючы ўсе меры бяспекі. Побач заўсёды знаходзіцца аўтацыстэрна».

Гэта, несумненна, не горшы варыянт утылізацыі трухлявых, незапатрабаваных дамоў з пункту гледжання эканомікі. Хоць, можа, не найлепшы з боку маралі. Людзям, якія жывуць побач, якія памятаюць, як суседзі будаваліся, адмаўляючы сабе нярэдка ў апошнім, цяжка станавіцца сведкамі спальвання суседніх дамоў.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У Зеляневіцкім сельсавеце Пружанскага раёна, адным з самых аддаленых ад райцэнтра, лік пустуючых жыллёвых пабудоў ідзе на сотні. У год іх зносяць, бывае, больш за дзясятак. І пытанне вырашаецца з сельгаспрадпрыемствамі. Тэрыторыя былой сядзібы адразу ўводзіцца ў севазварот, інакш намаганні будуць марныя. Праз годдва пусты падворак зноў пачынае зарастаць хмызняком ды пустазеллем. А так зямля прыводзіцца ў парадак і становіцца ворывам пад сельгаскультуру. Падобную форму выкарыстоўваюць і ў Ляхавіцкім раёне. Летась старшыні Альхоўскага сельскага Савета Вячаслаў Кулак і Крывошынскага сельскага Савета Юрый Чаранкевіч паказвалі мне некалькі свежых пляцовак і палеткаў, якія зусім нядаўна былі сядзібамі. Знос таксама праводзяць гаспадаркі, драўніну выкарыстоўваюць у якасці дроў у кацельнях.

Але ж нішто не можа служыць такой пераканаўчай ілюстрацыяй вымірання вёсак, як пакінутыя, забытыя, нікому не патрэбныя хаты. Некалі іх будавалі, радаваліся, калі спраўлялі наваселле, гадавалі дзяцей, спадзяваліся, што пасля гаспадароў будзе жыць у доме нехта з нашчадкаў... Таму ўсё ж найлепшым варыянтам уяўляецца, калі нават старыя пакінутыя хаты знаходзяць новых гаспадароў.

**Старшыня Лышчыцкага сельскага Савета Брэсцкага раёна Іна ДЗЯЧЭК** паказала мне прыгожы, амаль шыкоўны дом у вёсцы Пагубяцічы і расказала наступнае:

— Я толькі стала старшынёй, прыехала ў гэтую вёску. І выгляд закінутага, зарастаючага дома на краі вуліцы навеяў нейкую роспач. З калегамі мы правялі ўсю неабходную падрыхтоўчую работу, сабралі дакументы і прадалі дом з аўкцыёну тады яшчэ па сямідзесятым указе. Хату купілі брастаўчане Галіна і Віталь, як аказалася, руплівыя гаспадары. Праз некалькі гадоў Віталь так адрамантаваў, рэканструяваў, перамяніў былую пабудову, што яе стала проста не пазнаць. Гаспадары добраўпарадкавалі двор, пасадзілі кветкі, разбілі сад. Сям'я тут праводзіць лета. Пазней у вёсцы яшчэ адзін дом прадалі з аўкцыёну, бо блізка ад горада, — заключыла Іна Анатолеўна.

Але прадаюцца такія дамы рэдка, бо ёсць заканадаўчы нюанс. Прадаць нічыйны дом танна нельга, бо трэба правесці ацэнку, якую можа зрабіць толькі агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры. У канчатковы кошт уваходзяць усе выдаткі па ацэнцы, а таксама па афармленні дома і ўчастка. Ва ўмовах, напрыклад, Брэсцкага раёна атрымліваецца сума не менш за тры тысячы долараў у эквіваленце. Выходзіць, знесці такі дом можна, а прадаць танна — нельга. Вось і не займаюцца гэтым сельсаветы, бо клопат вялікі, а вынік непрадказальны. Памятаю, як адзін кіраўнік мясцовай улады з задавальненнем расказваў, што яны нядаўна знеслі дом пабудовы 1905 года, які доўга служыў вясковым дзецям школай. І шкада стала, зашчымела нешта ўнутры, што такому, па сутнасці гістарычнаму, аб'екту не далі шанцу.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ЯК ВЫЛЕЧЫЦЬ СТАРУЮ ХАТКУ

## У Краснапольскім раёне падзяліліся поспехамі ў рабоце з пустуючымі пабудовамі і агучылі, што перашкаджае працаваць больш плённа

**АСАБЛІВА добра пастаўлена работа па скарачэнні пустуючых і старых дамоў у Яноўскім сельсавеце. Яноўка — гэта той самы аграгарадок, які дзякуючы фінансавай падтрымцы міжнароднай тэхнічнай дапамогі нядаўна стаў хакейнай сталіцай раёна. Недахоп фінансаў тут кампенсуюць гаспадарчым падыходам да рашэння праблем, крэатыўным мысленнем і дысцыплінай. Магчыма, дзесьці ёсць алгарытм дзеянняў зусім іншы і нават больш эфектыўны, але ў далечыні ад іншых квітнеючых населеных пунктаў, якім часцей аддаюць перавагу інвестары, Яноўка па-свойму змагаецца за месца пад сонцам. І гэтай мэтанакіраванасці, напорыстасці ў добрым сэнсе слова, дыпламатычнасці трэба вучыцца.**

### Пацыент, хутчэй, мёртвы, чым жывы

**Старшыня Яноўскага сельсавета Наталля ЛАГУЦІНА** ўзначаліла сельсавет у 2014 годзе і па сабе ведае, наколькі цяжка было рэалізоўваць соты ўказ на тэрыторыі адчувальна атручанай цяжкім подыхам аварыі на Чарнобыльскай АЭС.



Раней пустуючыя дамы ў сельсавеце нават нанослі на карту.

— Спрабавалі розныя спосабы, — кажа яна. — Указ № 100 аднолькавы для ўсіх, а шляхі вырашэння пастаўленых у ім задач ва ўсіх розныя. Адзінага рэцэпта не існуе, трэба выпрацоўваць свой. Для мяне пустуючыя дамы былі менавіта як хворыя людзі, якіх трэба тэрмінова лячыць. Стварылі лакальныя нарматыўныя дакументы — надзялілі паўнамоцтвамі па рэалізацыі палажэнняў указа службовых асоб Яноўскага сельвыканкама, прынялі рашэнне аб стварэнні камісіі па абследаванні гэтых дамоў — і справа пайшла. І вельмі нам тут дапамаглі прадстаўнікі органаў тэрытарыяльнага самакіравання. Тэрыторыя аграмадная, 16 населеных пунктаў, было шмат пустуючых дамоў, паспрабуй даведацца, хто там жыў. Дзякуй старажылам, аказалі нам у гэтым дапамогу. Потым мы па гаспадарчых кнігах знаходзілі звесткі пра тых людзей.

Для работы з кожным будынкам спатрэбілася сабраць шмат дакументаў. На кожны была заведзена асобная папка — своеасаблівы пашпарт. Туды акумуляваліся ўсе запыты — у агенцтва па нерухомасці і зямельным кадастры, энерганагляд, райгаз, загс і гэтак далей. Тут жа перапіска з уласнікамі і спадчыннікамі.

— Дыяпазон іх пражывання вельмі шырокі, — расказвае суразмоўніца. — Тут і Расія, і Украіна, і Прыбалтыка. Кожнаму адпраўлялі лісты з апавяшчэннем, што спадчыннасць разбураецца, і цікавіліся, які намер яны маюць у адносінах да пакінутага без нагляду дома. У нас нават карта сельсавета была з пазначэннем рознымі колерам пустуючымі і старымі дамамі. Працавалі з кожным нашчадкам паасобку. Гэта як у бальніцы: дом — пацыент, які падлягае лячэнню, і мы павінны гэта рабіць рознымі спосабамі. Была справа, і ў суд звярталіся. А што рабіць, калі чалавек не рэагуе? Дзякуючы гэтаму дванаццаць грамадзян афармілі сваю спадчыннасць і навялі парадак.

### Сельскія метамарфозы

Рашучыя дзеянні мелі свой плён. Наталля Лагуціна прызнаецца, што адзін дом, які яны ўжо і не спадзяваліся выратаваць, нечакана стаў упрыгажэннем вёскі.

— Бабуля напісала завяшчанне на ўнука, а той пра яго нават і не ўспамінаў, — расказвае яна падрабязнасці. — Мы яму адправілі ліст, што пабудова ў жахлівым стане, прасілі навесці мінімальны парадак і не чакалі, што будзе такі эфект. Мужчына збіраецца зрабіць тут аграсядзібу. Месца ўсім на зайздрасць, побач рэчка.

У сельсавеце справа наладжана так: калі чалавек не можа рэанімаваць дом, хай хоць участак даглядае. І такіх людзей, якія садзяць агарод на сядзібе сваёй бабулі або цёткі, шмат. Дом выкарыстоўваецца як гаспадарчая пабудова, але вакол яго трава абкошваецца і знешні выгляд больш-менш падтрымліваецца.

На жаль, ёсць і апошняя стадыя для пустуючых дамоў. Гэта, калі нашчадкі зусім не рэагуюць, а пабудова ператвараецца ў груду дроў і шыферу.

— У 2014 годзе ў нас было 58 пустуючых дамоў, зараз засталося 15. Але стала больш спрахнелых, — уздыхае старшыня сельсавета.

### Верх — на дровы, ніз — у расход

Калі дом прызнаны спрахнелым і ёсць згода на яго знос, сельсавет шукае спосаб, як гэта зрабіць танней. Дровы на вёсцы — рэч запатрабаваная і назапасіць іх бясплатна ахвотных хапае.

